Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 199 (5032) ВЕРАСНЯ 6 ЧАЦВЕР 1934 г. год выдання XVIII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

## Совецкі генеральны консул у Харбіне патрабуе расследвання фактаў збіенняў арыштаваных грамадзян СССР і пакарання вінаватых

ХАБАРАЎСК, 4 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Харбіна, ч. в. а. генеральнага консула СССР у Харбіне т. РАЙВІД, у дадатак да залўленых ім раней пратэстаў супроць збіенняў і катаванняў арыштаваных совецкіх грамадзян, прапавадзіў учора пры асобай ноце намеснику асобага дыпламатычнага агента Манчжоу-Го ў Харбіне СІМАМУРА акты медыцынскага абследвання совецкіх грамадзян тт. ГРЫГОР'ЕВА і ГАЛАВІНАЙ, якія знаходзяцца зараз, пасля выхаду з месц зняволення, на лячэнні ў цэнтральнай бальніцы КУЧ.

Тав. Райвід настойвае ў сваёй ноце на «правядзенні тэрміновага расследвання даных бясспрэчных фактаў прымянення паліцэйскімі і грамадзянскімі ўладамі ў адносінах арыштаваных грамадзян СССР недапушчальных спосабаў фізічнага ўздзеяння — збіенняў і катаванняў, — і на суровым пакаранні асоб, вінаватых у гэтым».

## НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ПАЧАЎСЯ

Пачатак вучэбных заняткаў у школах нашай краіны ператварыўся ў масавае народнае свята. У падрыхтоўцы школ да навучальнага года прынялі актыўны ўдзел мільённыя масы рабочых і калгаснікаў. Любоўю і выключнымі клопатамі акружае наша школу совецкая грамадзянскасць.

Лозунгі вучобы, аб чым з такой настойлівасцю гаворыць тав. Сталін, пранізваюць літаральна ва ўсе поры нашага жыцця, творчага жыцця мільённых мас. Моладзь прагне ведаў, моладзь хоча вучыцца і вучыцца комунізму.

У Беларускі політэхнічны інстытут на 325 месц было падана дзвюма тысячамі заяў. У інстытут совецкага права на 150 месц — 500 заяў. У архітэктурна-будаўнічы тэхнікум па 100 месц — 520 заяў. У Менскі белпедтэхнікум на 210 месц—509 заяў. У Магілеўскую музычную школу на 50 месц —600 заяў.

Ці не гаворыць гэта аб велізарнейшым імкненні нашай моладзі да вучобы, да аўладання ўсімі галінамі тэхнікі, навукі і мастацтва.

Як рэзка выдзяляецца наша квітнеючая рачаіснасць на фоне глыбокага развалу і адсталасці капіталістычнага Захада, дзе 400 тыс. чалавек, скончыўшы сёлета школы Германіі, асталіся беспрацоўнымі, дзе 300 тыс. маладых людзей Польшчы, скончыўшых сёлета школу, не знаходзяць сабе прымянення, дзе тое тысяч частка выдрасталі Аўстрыі мараць стаць пекарамі, мясніками, кухарамі, бо так можна будзе як-небудзь слабе насыціць.

Толькі мы ў краіне пролетарскай дыктатуры, кіруемай вялікай партыяй Леніна-Сталіна, забяспечылі разумнае, культурнае, здаровае жыццё для ўсіх працоўных, з кожным годам адкрываем дзесяткі і сотні новых школ, тэхнікумаў, ВНУ і ВТНУ, лабараторый і інстытутаў для сваёй моладзі. Гэта прымушае нас вельмі ўважліва адносіцца да ліквідацыі ўсякіх дробных непаробак, якія здараюцца пры такім масавым разгортванні навучальных устаноў. Іменна таму мы павінны з усёй рашучасцю прымушаць к пораджу тых, якія у захапленні колькасным ростам забываюць пра якаснае забеспячэнне навучальнага года.

Роўна ў 9 гадзін першага верасня пачаліся заняткі ў Менскім індустрыяльна-педагагічным тэхнікуме, але і сёння студэнты яшчэ не забяспечаны інтэрнатам і харчаваннем. Пачаў заняткі Магілеўскі педагагічны інстытут, але пераважная большасць студэнтаў усё яшчэ не забяспечана інтэрнатам.

У Высачанскім дашкольным педтэхнікуме праз год пасля пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб выкладанні геаграфіі і гісторыі ўсё яшчэ не ўключылі геаграфію ў вучэбны план. Педагогіку выкладае настаўніца, выключаная з другога курса Менскага вышэйшага педагагічнага інстытута за непаспяховасць.

1 верасня пачаліся заняткі ва ўсіх школах Гомеля. Не працуе толькі руская школа імя Калініна, Гарком партыі, які 19 чэрвеня прыняў рэзалюцыю аб дрэнным абслугоўванні нацыянальных меншасцей, не стварыў усіх умоў, каб тысяча дзяцей гэтай школы магла вучыцца разам з усімі дзецьмі горада. Загадчык аддзела асветы Данільчык, які самаўласна скараціў колькасць рускіх школ на Гомельшчыне, падпісаў з будаўнічым трэстам дагавор аб рамонце школы імя Калініна з разлікам, каб яна была гатова не раней 1 лістапада.

Мала ўвагі аддаюць школьнай справе ў Бешанковіцкім раёне. Хоцінская, сторская, пяцігорская, сержыцкая і рад іншых школ не ўкамплектаваны настаўнікамі, не адраманцтаваны, і пачатак навучальнага года ў гэтых школах сарван.

Прыведзеныя факты лішні раз сігналізуюць аб неабходнасці ліквідацыі тых саноўна-панскіх адносін, якія назіраюцца ў радзе раёнаў да школ, аб неабходнасці мабілізацыі ўсіх сіл на ліквідацыю недаробак у падрыхтоўцы да навучальнага года. Той факт, што навучальны год пачаўся, не дае нікому права на самасупакой.

Усеагульнае навучанне — гэта не лозунг, гэта—канкрэтная жывая справа, якую краіна вырашыць толькі пры дапамозе ўсёй пролетарскай грамадзянскасці. Наша краіна — багата фондамі. Але самы каштоўны з іх — нашы дзеці. Невыпадкова партыя і ўрад аддаюць так многа ўвагі школе. Беззаветнай адданасцю справе соцыялістычнага выхавання нашай змены, большэвіцкай настойлівасцю, усведамленнем вялікай і гаварвай адказнасці перад тварам квітнеючай, у баях вырастаючай нашай соцыялістычнай будучыні створым і забяспечым усе ўмовы для паспяховай вучобы нашых дзяцей комунізму.

## Недапусціць страт на ўсіх працэсах уборкі і апрацоўкі ільну

### ДАБ'ЕМСЯ У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ВЫКАНАННЯ ПЛАНА ХЛЕБАЗДАЧЫ КОЖНЫМ СОУГАСАМ, КОЖНЫМ КАЛГАСАМ І КОЖНАЙ АДНААСОБНАЙ ГАСПАДАРКАЙ

### У Лёзненшчыне ігнаруюць барацьбу за якасць ільнопрадукцыі

Лёзненскі раён закончыў цераблення ільну адным з першых у БССР. Здавалася-б, што і наступныя працэсы яго апрацоўкі таксама павінны былі быць своечасова закончаны. Аднак, на справе гэтага няма. Ужо зараз вельмі адчуваецца разрыў паміж рассцілам, падёмам і далейшай апрацоўкай ільну.

Некалькі прыкладаў.

Калгас Герой працы, Замшанскага сельсовета, павінен здаць 714 цэнт. трасты і 40,69 цэнт. ільнавалакна. Увесь лён на плошчы 70 гектараў ужо даўно разасланы, а палнята са спеліш і здана ільназаводу толькі 25 цэнт. трасты. Да апрацоўкі ільнавалакна яшчэ не прыступілі, хоць у гэтым калгасе ёсць 10-12 гектараў ільну, зусім выляжанага і гатовага да падёму. Лён знаходзіцца на спелішчы ўжо больш 3 тыдняў.

У калгасах Горбаўскага сельсовета наглядаецца вялікі разрыў паміж падёмам трасты са спеліш і здачай яе ільназаводу. Так, не гледзячы на тое, што 50 проц. разасланага ільну ўжо даўно паднята са спеліш, заводу здана толькі 5 проц.

У рэзультаце злачы трасты па раёну толькі зараз пачынае разгортвацца. На 1 верасня план выканан на 4,9 проц. Да апрацоўкі ільнавалакна прыступілі толькі 3-4 калгасы, здана ўсяго толькі 3 цэнтнеры. Большасць калгасаў раёна да апрацоўкі ільнавалакна яшчэ не падрыхтаваны. Не вылучаны звенні мялышчых і трапальшчых, нормы мяння і трапання на праўленнях калгасаў не абтараваны і не даведзены да калгаснікаў. У калгасе «Віцебскі пролетарый», Замшынскага сельсовета, і іншых калгасах нават яшчэ не скончан рамонт ільнамялак.

Асабліва звяртаюць на сябе ўвагу факты злачы трасты нізкай якасці — рэзультат дрэннага захавання агратэхправіл у часе вылежвання на спелішчы.

Жывым прыкладам гэтаму можа служыць той-жа калгас «Герой працы». У брыгадзе № 1 Пульхова Сямёна большая колькасць ільну разслана на ўзвышаным месцы, даступным ветру, што катэгарычна забараняецца. Сартоўка ільну пасля збмалоту праведзена дрэнна. У адным пучку тут можна знайсці і тоўсты і тонкі лён, і доўгі, і вусім кароткі. У многіх мясцах лён разаслан тоўстым пластам. Ёсць шмат заблытанага ільну. Пераварачванне трасты, якая напалову вылежалася, не праводзіцца, таму лён вылежваецца няроўнамерна. Догляд за спелішчамі не арганізаван.

Калгасы Замшанскага сельсовета не з'яўляюцца адзінымі ў раёне калгасамі, якія дрэнна апрацоўваюць ільнатрасту. Паводле даных ільназаводаў, у паступаючай трасце пераважае кудзельная і зусім мала турбінная.

Калгас «Чырвоная Ласосіна», Кабыльніцкага сельсовета, павінен здаць трасту сярэднім нумарам 1,54, здана-ж траста нумарам 1—1,25. Калгас «Новы свет», Гладанскага сельсовета, замест нумара 1,58 здаў трасту выключна першым нумарам.

Аб тым, што можна дабіцца высокага нумара трасты, паказвае практыка Каралеўскага сельсовета, дзе калгасы імя Леніна і «Уперад да соцыялізма» ў рэзультаце ўмелага прымянення агратэхнічных правіл, належнага і клапатлівага догляду, здалі трасту выключна № 1,75 і 2. Да № 1,75 давёў апрацоўку трасты і калгас «Спаборнік», Велікоўскага сельсовета.

Ужо зараз, у першыя дні здачы трасты, наглядаюцца факты звароту вялікай колькасці падвод з трастой назад—з ільназаводаў у калгасы. Напрыклад, траста калгасаў імя Буданнага, «Чырвоны працаўнік», імя Карла Маркса, «Першае мая», «Віцебскі пролетарый», «Трудавік» і інш. не была прынята ільназаводам з прычыны недалежкі, пералежкі, вялікай вільготнасці, засмечанасці і дрэннай сартоўкі.

Ільнавалакно паступіла 8-10 нумарам, у той час, калі раён абавязаўся здаць ільнавалакно не ніжэй 12 нумару. Гэтыя факты гавораць аб тым, што ўжо зараз ствараецца пагроза зрыву ўстаноўленай для раёна гатунковасці ільнавалакна.

Зусім недапушчальным з'яўляецца тое, што кіраўнікі ільназаводаў ніякай сувязі з калгасамі не маюць. Яны ператварыліся выключна ў механічных прыёмшчыкаў. Работнікі заводаў у калгасы не заглядваюць, не даюць ім ніякіх указанняў на апрацоўку ільну.

«Брыгада «Звязды»: АЎГІННЯ ЯКУБЦЫНЕР, АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

### ЛЁН АСЯДАЕ НА МЕСЦЫ

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Лён у БАРЫСАЎСКІМ раёне займае 4 проц. агульнай пасеўнай плошчы. Процант, быццам, нязначны. Аднак, гэтыя 4 проц. складаюць 2 тыс. гектараў. Прычым, гэта высокаякасная і каштоўная культура ў гэтым годзе павінна даць дзяржаве 158 тон першакласнага валакна. Колькасць, як відаць, вялікая.

Як-жа абстаіць справа з ільном у гэтым раёне? Уборка, абмалот, рассціл—пройдзены этап. У многіх мясцах прыступілі да падёму трасты.

На 30 жніўня паднята каля 300 гектараў трасты. Больш таго, ужо намята і натрапана 63 цэнтнеры ільнавалакна.

Рад калгасаў пачалі здачу валакна дзяржаве па кантрактацыйных дагаварах. Калгас «Палітадзелец» здаў 147 кгр. валакна, калгас «Ударнік» 47.

Аднак, гэта зусім не азначае, што так абстаіць справа ва ўсім раёне. Варта параўнаць дзве лічбы, каб пераканацца ў адваротным. У раёне натрапана 63 цэнтнеры ільнавалакна, а здана дзяржаве толькі 3. Адноасобнікі натрапалі 40 цэнт. ільнавалакна, але да гэтага часу не здалі дзяржаве ніводнага кіло. З гэтага відаць, што ў раёне не мабілізавана ўвага на першачарговую здачу ільнавалакна дзяржаве, і лён асядае на месцы.

Паводле афіцыяльных даных у раёне падрыхтавана 560 сушыльна-мяльных пунктаў, якія, на думку райземаддзела, поўнасцю забяспечваюць своечасовую апрацоўку ільнатрасты. Аднак, гэта не зусім так. Да «гатовых» сушылень аднесены ўсе сёўні, хоць яны не прыстасаваны да апрацоўкі ільну. Тут яшчэ няма належнага інвентара, не вылучаны адказныя за работу сушыльна-мяльных пунктаў. Гэта пацвярджаецца фактамі, выяўленымі праверкай калгасаў ХАЎХОЛІЦКАГА і ЛОШЫЦКАГА сельсоветаў.

Барысаўшчына павінна памятаць, што і да яе, як і да ільнаводчых раёнаў, поўнасцю адносіцца рашэнне ЦК і СНК ад 12 жніўня, якое абавязвае раённыя арганізацыі аддаць выключную ўвагу ільну.

ЧЫКУН.

Атрад трактарыстаў Сарабузскай МТС у Крыме, скончыўшы ўборку зернавых, пераключыўся на заблёвае ворыва, аруць глыбока (20 см.), без агрэхаў, эканомячы гаручае. У брыгадзе добра пастаўлен улік. У канцы работы змены дасягнала ўлічваецца выкананне нормы ворыва і колькасць выдаткаванага гаручага.

На здымку: Улік работы трактарыста ШПАЦЕНКА, які за змену добра ўзараў 3,5 га, з'эканоміў 3,5 кгр. гаручага.

### АРГАНІЗАВАЦЬ ДОГЛЯД ЗА ІЛЬНОМ НА СЦЕЛІШЧАХ

ПОЛАЦК. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Перадавыя калгасы раёна прыступілі да здачы ільнатрасты і ільнавалакна дзяржаве. Рад калгасаў ужо набліжаецца да сканчэння гадавога плана ільнездачы. На 4 верасня на склады Заготільну паступіла 3.356 кг. ільнавалакна, на склады ільназаводаў паступіла больш 6 проц. гадавога плана ільнатрасты.

Калгас імя Сталіна М. Сітнянскага сельсовета, разгарнуўшы мяцё і апрацоўку ільну, здаў ужо больш 5 цэнт. ільнавалакна 13, 14 і 15 нумара.

Пачалі таксама здачу валакна іншыя перадавыя калгасы раёна. 1 верасня ў дзень XX МЮД'а на пункты Заготільну паступіла больш 2 тон ільнавалакна.

Першы дзень паступлення ільнавалакна і ільнатрасты паказвае, што апарат Заготільну і самі партыйныя арганізацыі на мясцах фармальна аднеслісяя да рэалізацыі пастановы ЦК і СНК аб уборцы і першапачатковай апрацоўцы ільну. У радзе калгасаў лён часамі пералежвае на сцелішчах. У калгасах, «Верны шлях» і «Усходы Леніна», Саланіцкага сельсовета, увесь лён пачарнеў ад пералежкі. Рэдка ў якім калгасе вылучаны наглядальнікі за ільном на сцелішчы. У калгасе «Верны шлях» як пры цераблённі, так і пры рассціле лён не сартавалі. Не сартуюць яго і зараз пры падёме.

Калгас «Чырвоны араты», Астроўчыцкага сельсовета, увесь лён разаслаў на забалочаных лугах. Калгасы «Колас», «Чырвоны маяк» і «Добраволец», Астроўчыцкага сельсовета, лён разаслалі таксама, што ён пачынае ўжо псавацца. Вылучыўшы адказнага па ільну, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік», Вохацінскага сельсовета, члены праўлення пра лён перасталі і думаць. Лён густа разаслан на жытнішчы, і пакінут без усякага нагляду ў калгасе «Чырвоны луч», Сошніцкага сельсовета. Больш 20 дзён разасланы лён ляжыць неперавернутым. Рассціл ільну ў калгасе «Чырвоны марак», Астроўчыцкага сельсовета, праводзіцца тоўстымі пластамі. Праўленне сушкіх мер не прымае.

У Полацкім раёне нямала калгасаў, дзе ёсць больш 60 гектараў ільну. Аднак, ні райза, ні МТС не падумалі пакуль аб тым каб вылучыць у гэтых калгасах вываленых намеснікаў па ільну.

Большасць ільну ў раёне была разаслана да 20 жніўня. Уже 15 дзён лён ляжыць на сцелішчах, а ніякага нагляду за ім няма. Раённыя арганізацыі, занятыя загатоўкамі збожжа, пра лён зусім забылі.

Як правіла, ва ўсіх калгасах падём трасты і апрацоўка ільну адкладаюцца пасля капання бульбы. Гэта значыць, што лён можа гніць: раз на плану не вылучана, то яго паднімаць не трэба. Ад такой «чарговасці» можа пагніць увесь лён. Гэта павінны памятаць раённыя арганізацыі, якія фактычна самі прытрымліваюцца гэтай чарговасці.

НЕЙДЛІН.

### НОВЫ КАЛГАС ІМЯ ПЕРШАГА З'ЕЗДА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

ЛЁЗНА. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Працоўныя адноасобнікі Лёзненскага раёна адзначылі прыезд тав. ЧАРВЯКОВА ў іх раён новым прылівам у калгасы, арганізацыяй новых калгасаў.

11 бядняцка-сераднякцкіх адноасобных гаспадарак в. Ушыўка, Сутоцкага сельсовета, арганізаваліся ў калгас імя ПЕРШАГА З'ЕЗДА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ. У Горбаўскім сельсавеце таксама арганізаваўся новы калгас імя тав. Чэрвякова з 13 адноасобных гаспадарак в. Жыдзенаве.

Адноасобнікі в. Лідзіна, Серніцкага сельсовета, у колькасці 13 гаспадарак уступілі ў суседні калгас «Чырвоная зорка» і 7 гаспадарак в. Жуі ў калгас «Рассвет».

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

### КАЛГАС ІМЯ 17 ПАРТЗ'ЕЗДА СКОНЧЫЎ ДРУГІ УКОС

КРЫЧАЎ. (Па тэлеграфу ад карэспандэнта «Звязды»).

Калгас «17 партз'езд» скончыў другі ўкос сена. Убрана 152 гектары сенажаці. Другі ўкос значна лепшы чым першы.

ВІШНЕЎСКІ.

### КАЛГАСЫ РАГАЧОЎСКАЙ МТС ВЫКАНАЛІ ПЛАН СЯЎБЫ АЗІМЫХ

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу).

Калгасы зоны РАГАЧОЎСКАЙ МТС выканалі план азімай сяўбы. Сяўба праведзена на плошчы 5590 гектараў супроць плана ў 5550 гектараў.

Дырэктар МТС КУДЗЯН.

### Пачалася масавая ўборка бульбы

Барысаў. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Калгасы Барансчага сельсовета пачалі масавую ўборку позніх сартоў бульбы, якая ўжо добра вызрала.

Бульбоўнік зжат і выкарыстан на сілас.

Калгас «Завет Леніна» ужо ўбраў 3 гектары бульбы. Ураджай вызначаны—1.000 пудоў з аднаго гектара. Першая конка ідзе на здачу дзяржаве. Калгас «Завет Леніна» ўжо здаў дзяржаве 3 тоны бульбы.

Другі калгас «Чырвоная ніва» таксама ўбраў 3 гектары бульбы і здаў дзяржаве 2 тоны новага ўраджаю.

Капаюць бульбу і ў калгасе «Максімаўка». Гэтыя калгасы ўжо закончылі сяўбу азімых культур, сіласаванне і пераключылі ўсе сілы на ўборку бульбы і закончэнне заблёвага ворыва.

Барысаў, 4. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Сёння прыступілі да капання бульбы калгасы Хаўхоліцкага і Жартайскага сельсоветаў. Добрае надвор'е вельмі спрыяе бульбаўборцы.

Калгас «6 з'езд советаў» ужо выкапаў 15 гектараў бульбы. У гэтым калгасе здачу дзяржаве бульбы зразумелі, як першую запаведзь. Адразу з поля адвезена на прыёмачныя пункты 222 цэнт. адборнай высокаякаснай бульбы, што складае 100 проц. калгаснага плана. Праз 2-3 дні ўборка будзе закончана дзякуючы энтузіязму калгаснікаў, штодзённа перавыкон ваючых нормы.

Заканчвае здачу бульбы дзяржаве калгас «Чырвоная Любагоўшчына», папярэдні сканчэння калгас «Чырвоная Рагатка».

Асабліва паднімае настрой калгаснікаў высокі ўраджай бульбы. Адсюль паступаюць весткі, што гектар пасеву дае не менш 160 цэнт. (1.000 пудоў) бульбы супроць 115 цэнт. (700 пудоў), запраектаваных па плану.

У калгасе «Чырвоная Яблычына» пад адным карчом налічваецца да 18 бульбін, даючых разам 2-3 кг. Гэта перавышае самыя аптымістычныя падлікі аб вазе калгасных працадзён. У той-жа «Чырвонай Яблычыне» замест раней меркаваўшыхся 8-10 кг. бульбы на адзін працадзень будзе мінімум 15-16 кг.

П.

### ТЭЛЕГРАМА ТАВ. ГАЛАДЗЕДА

Старшыням райвыканкомаў: ЧЭРЫКАЎ — т. Ратайко, ПЕТРЫКОЎ—т. Граду, ЧАЧЭРСК—т. Падрэцкаму, ТАЛАЧЫН—т. Федарэнчыку, КАПЫЛЬ—т. Рубен, ДЗЯРЖЫНСК—т. Вансоўскаму, ДРЫСА—т. Антонаву, БАБРУЙСК—т. Мінчонку, БЯРЭЗІНА—т. Шкляр, БРАГІН—т. Халімонаву, НАРОЎЛЯ—т. Зелькіну, БЫХАЎ—т. Грынкевічу, ЗАСЛАЎЛЬ—т. Вароніну, ПОЛАЦК—т. Кацу, СЛУЦАК—т. Князеву; старшыням горсоветаў: ВІЦЕБСК—т. Аверыну, ГОМЕЛЬ—т. Карначову.

У вашых раёнах да гэтага часу не ліквідавана як агульная запазычанасць па зарплаце, так і асабліва настаўнікам і дактарам. Прапаную ва працягу 3-5 дзён ліквідаваць усю запазычанасць па зарплаце і дапажыць Саўнаркому па тэлеграфу.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.

## ЗА РУБЯЖОМ

### КРУШЭННЕ ПОЕЗДА НА КУЧ СКАРЫСТОЎВАЕЦЦА ДЛЯ НОВАЙ АНТЫСОВЕЦКАЙ КАМПАНІІ

БЕЙПІН, 4 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Харбіна, крушэнне поезда № 11 на Паўднёвай ветцы КУЧ скарыстоўваецца японска-манчжурскімі коламі для новай разнузданай антысовецкай кампаніі і для адкрытай прапаганды гвалтоўных дзеянняў супроць совецкіх грамадзян, якія працуюць на чыгунцы.

Замоўчваючы факты цяжкага раслення совецкага грамадзяніна Трыгубенка, малодшага кандуктара поезда № 11, японскае агенцтва Кокуцу ў паведамленні з Чанчуня робіць гнусныя намёкі на тэму аб тым, што «бандытамі не ўведзен у палон ні адзін совецкі грамадзянін». Агенцтва паведамляе далей, што, на думку ўрада Манчжоу-Го, замах на поезд № 11 з'яўляецца «не проста бандыцкім нападам, а тэрарыстычным актам варожых Японіі і Манчжоу-Го элементаў».

На падставе падобных паведамленняў харбінскі друк разгортвае адкрытую кампанію за ваенную акупацыю КУЧ японскімі ўзброенымі сіламі. Неафіцыяльны орган японскай ваеннічыны ў Харбіне «Харбинское время» піша: «Лепшым выхадам са становішча было-б, калі-б на ахову ўсёй лініі КУЧ сталі японскія часці, паколькі бясспрэчна даказана (у дужках клічнік), што совецкія служачыя звязаны з бандытамі».

Характэрным узорам прапаганды за акупацыю КУЧ з'яўляецца таксама змешчаны 2 верасня ў японскай газеце «Харбін сімбун» артыкул японца Атарасі Нінакава, які называе сябе прафесарам міжнароднага права. Гэты «вучоны» дае наступны рэцэпт барацьбы з бандытызмам па КУЧ: «Неабходна акупаваць КУЧ і ахоўваць яе японскімі ваеннымі сіламі. Японія, у парадку акта, апраўдваемага правам самаабароны, павінна акупаваць усе станцыі КУЧ японскімі сіламі. Так трэба для самаабароны японцаў і аховы шчасця чалавецтва (у дужках клічнік)».

З паведамленнем агенцтва Кокуцу з Чанчуня аб тым, што бандыты, напаўшыя на поезд № 11, былі «вельмі добра ўзброены», цікава супаставіць паведамленне таго-ж агенцтва з Харбіна аб тым, што «шайка была ўзброена японскімі вінтоўкамі ўзору 38».

У замежных колах Харбіна звяртаюць увагу на некаторыя падазроныя акалічнасці нападу на поезд № 11. У той час, як звычайна японска-манчжурскія ўлады аказваюцца бяссільнымі справіцца з бандытамі і вызваліць захопленых імі ў палон, на гэты раз праз двое сутак пасля нападу бандыты былі знойдзены японскім атрадам, і ўсе ўведзеныя ў палон пасажыры — у большасці сваёй японцы — вызвалены.

Супастаўляючы ўсе гэтыя факты з кампаніяй за акупацыю КУЧ японцамі, неадкладна разгорнутай пасля нападу на поезд № 11, у харбінскіх колах выказваюць дапушчэнне, ці не з'яўляецца ўвесь гэты напад буйнай провакацыяй.

### ПРАЕКТЫ „РЭАРГАНІЗАЦЫІ" І КАМПАНІЯ ЗА АКУПАЦЫЮ КУЧ

ХАБАРАЎСК, 3 верасня. (БЕЛТА). За апошнія дні харбінскі друк узмоцнена загаварыў аб намеры некаторых японска-манчжурскіх колаў «рэарганізаваць» КУЧ. Японскае агенцтва «Дзмпо цусін» паведамляе з Чанчуня аб тым, што «манчжурскія ўлады рашылі правесці рад мерапрыемстваў самага шырокага маштабу па рэарганізацыі КУЧ». Газеты прадрэчы на намякаюць, што гутарка ідзе аб абмеркаванні японска-манчжурскімі коламі новых мерапрыемстваў, накіраваных супроць совецкіх грамадзян-служачых КУЧ і супроць дагаворных праў СССР, забяспечаных пекінскім і мукдэнскім дагаворамі.

У гутарцы з прадстаўнікамі харбінскай прэсы, прыбыўшы гэтымі днямі ў Харбін з Чанчуня член манчжурскай делегацыі на такійскія перагаворы аб продажы КУЧ, японец Сугіхара заявіў аб неабходнасці «кардынальна змяніць існуючае становішча на КУЧ, паколькі захаваныя да сучаснага моманту парадкі на дарозе не адпавядаюць становішчу імперыі» (Сугіхара, як відаць мае на ўвазе Манчжоу-Го).

У кампаніі за «рэарганізацыю» КУЧ харбінскі друк у якасці «аргументаў» шырока карыстаецца наклёпніцкімі вымысламі аб мнімай сувязі совецкіх грамадзян-работнікаў КУЧ з бандытамі.

### „ЯПОНІЯ ІМКНЕЦЦА ЗАХАПІЦЬ КУЧ"

РЫМ, 4 верасня. (БЕЛТА). Газета «Дзль-Попола» піша, што, на думку кампетэнтных замежных наглядальнікаў, Японія несумненна імкнецца захапіць КУЧ і робіць усё, каб абяспэніць кошт дарогі.

Газета канстатуе, што прадаўжаючыеся арышты совецкіх служачых, як відаць, робяцца знарок, каб справакаваць СССР.

## На тэму дня

# УВАГУ САКРАТАРУ СЕЛЬСОВЕТА

Пісара запаснога або сельскага гарасту мы ўлуўлем як чалавека, грапіўшага рэшткі свайго розуму, разіта, які займаецца п'янствам, збарніцтвам, прымушае памяць пад сабой шапку. Так і было ў нагаматнай вёсцы. На пісара глядзелі, як на пана, які выпхнуецца з ульнага асяроддзя. Сваё панскае пісар падтрымліваў сяброўвам з багатай часткай вёскі, сяла, прцарам, халоднай, зубатычынамі, якія пяводзіны заахвочвеліся, бо ны лішчэ раз давялі арэзумець бедце, каб яна не ўмешвалася ў янскія справы.

Тып старога пісара ў нашай сацыяй вёсцы здышоў у нябыт. Сакратар сельсовета, — гэта ў першую чаргу грамадскі працаўнік, які па адносіцца да ззаў саляцтва, туе на малейшыя скаргі.

Сакратар сельскага совета ўлуўоцца намі як энергічны, палітычны грамотны, чулы работнік, які годзенна гаворыць з масамі на трабнай партыі і ураду мове.

І недахоп наш у тым, што ў асобных масцах пры падборы сакратара льскага совета мы часта не правям яго ўсебакова, не падрыхтоўсм яго. Часта на мясцах выхоць толькі з яго граматнасці, з го, наколькі ён ведае скружаюе насельніцтва.

Той факт, што сакратар Бабоўяго сельсовета, Жлобінскага раёна, АБРАВОЛЬСКІ вызваліў усіх членў сельскага совета ад кан'юнктурнга падатку, ведаў аб мясавым ыгаванні зямлі членам сельсовета ЧАРБАКОВЫМ МІНАЙ, ведаў аб м, што рахункавод сельсовета учоткай картцы запісаў сабе 0 гектара, хоць ён фактычна сапу 0,60 гектара і т. п.—яшчэ раз паяджае, што належнай увагі сакатару сельсовета мясцовыя арнізацыі яшчэ не удзеляюць.

Ад сакратара сельскага совета ў гім запежыць правільнае праведзенне усіх кампаній па загах, падатках, учот аб'ектаў абзлення, своечасовае і правільнае учэнне ўсіх відаў абавязацельзу, бо праз яго рукі ўсё гэта аходзіць.

1477 сакратароў сельскіх советаў ць у Беларусі. Але, на жаль, аб рабоце, социяльным стане, мы ньмі мала ведаем, бо нават наснік загадчыка аддзела кадраў ЗК тав. МАЙЗІТ таксама не можа зець колькі сярод сакратароў льскіх советаў комуністаў, комсмольцаў, колькі з іх скончылі ры і т. д.

Калі добра працуе сакратар сельага совета, тады не можа мець сца ўтойванне плошчаў; добра цуюць члены сельскага совета, ць чоткасць і план у рабоце сета, кожны калгаснік і аднаасобк атрымлівае патрэбную спраўку і каз — тады лягчэй працаваць эзідыуму і старшыні сельскага ета.

І Па-дзелавому правядзем падрыхтоўку да ўсебеларускага з'езда рабселькораў.

# Калгасную вытворчасць— на першае месца

Насценная газета ў калгасе «Чырвоныя Яромкавічы» выходзіла і ў мінулым годзе. Галоўным яе недахопам было тое, што газета не займалася пытаннямі калгаснай вытворчасці, арганізацыйна-гаспадарчымі слабарніцтвам. Пераважалі заметкі, якія часта калгаснікі называлі (і часамі ўсур'ез) правільнай плёткамі.

З вясны гэтага года мы свае газеты стаў выпускаць часцей і лепшай на вместу, Рэдактарам выбралі старога сялькора, былога чырвонага партызана т. Фралова Кузьму. Ён дапамогу ў афармленні газеты прынялі мясцовых выкладчікі.

Мы паставілі сабе як галоўнае правіла перадаваць вопыт перадавікоў, паказваць прычыны адставання тых ці іншых звенняў калгаса.

Вось прыклад. У часе веснавой пасяўной кампаніі ўперадзе ішла брыгада № 3 на чале з брыгадзірам Франковым Данілам. Мы паказалі ў газеце, як Франкоў кірує брыгадай, як ён рэнсе за ўсіх устае і заўсёды вечарам размяркоўвае працу. Усё ў яго на сваім месцы — плугі, бороны, хамуты і аброці. Дзеньгіна добрал, выхал на работу раніц, улік працы акуратны.

Адставала брыгада № 2 Рыжкова Сяргея. Мы паказалі, чому яна адстае. Мы зладзілі экскурсію. Усхрылі такія непаладкі: калгаснікі не ведаюць (і брыгадзір таксама), дзе стаяць бороны, і іх прыходзілася шукаць перад выхадам на работу.

Увалі ў калгасе «дошку гонару» з малюнкамі.

У выніку адставшая брыгада падцягнулася.

Пачалася ўборка. Зноў брыгада Франкова ішла ўперадзе. Мы паказалі «сакрэты», як поспехаў.

Жалі ў нас і сярпамі. Тут мы паказалі лепшыя звенні, лепшых ударнікаў. Напрыклад, Чарнякову Арыну 55 год, якая зжынала ў дзень 0.25—0.34 гектара; Рудакову Ганну, якая зжынала каля 0,29 гектара.

У часе ўборкі мы арганізавалі падрабанне каласоў і дазоры піперацыі па ахове ўраджаю. Страт сёлета не было.

Калі пачалася малацьба і хлебапастаўкі, мы зноў сталі паказваць лепшых ударнікаў. Вось Ціханская Прося, Сільчанка Ганна і Ульяна, Радакова, Франкова Марыя на галёшу-дзве алпачнуць і малоцяць, зноў малоцяць. Такіх мы адзначылі гонарам.

Хлебапастаўкі ў 32 тоны наш калгас выканаў за 6 дзён, разлічыўся з дзяржавай да 5 жніўня пасёлку.

Старшыня калгаса т. Сафрановіч аб гэтым гаворыць так:

— Адзін я ўсяго не ўбачу, аб усім не здагадаюся. Яна — мае вочы, яна — памочнік па арганізацыі мас, яна — сама арганізатар.

Ну і самі мы не толькі пішам, а і на рабоце стараемся паказаць прыклад, быць перадавымі ўдарнікамі па пяру і калгаснай працы. Трэба смела сказаць, што наша газета «За большэвіцкі калгас» памагла дапамагла калгасу пры дапамозе політадзела МТС выйсці з ганебнага прарыву ў перадавыя рады па сяўбе, уборцы, хлебапастаўках.

Зараз мы змагаемся за высокакасны лён, за баявое капанне і здачу дзяржаве бульбы. Ільну ўжо здалі дзяржаве звыш 200 кілограм № 12 і 14. Арганізуем масы на тое, каб здаць дзяржаве лён да 1 верасня. Бульбу праз 5-6 дзён здамо дзяржаве поўнасцю ў колькасці 32 тон.

У бліжэйшы час закончым аблёва. Убіраць другі ўкос сена, заклаці яшчэ 200 тон сілосу, стварыць магутную кармовую базу—такія мы ставім перад сабой і калгасам задачы, такі палярунак рыхтуем з з'езду рабселькораў.

Селькоры-ударнікі калгаса «Чырвоныя Яромкавічы», Аршанскага раёна:
**Фралоў Кузьма** (адказны рэдактар),
**Мажуеў Ерамей,**
**Сіпчанка Даніла,**
**Ціханскі Пэнкрат,**
**Сафрановіч,**
**Ціханскі Сямён.**

## АД УПАЎНАВАЖАНАГА КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ ПРЫ СНК СССР ПА БССР

За апошні час некаторыя асобы прабавалі рабіць незаконныя абследаванні ад імя Камісіі совецкага кантроля і бюро скаргаў, не маючы на тое права, між тым у абследуючых асоб не правяраюцца дакументы на права правядзення кантролю, а прад'яўленне такіх дакументаў абавязкова.

Кантралёры Камісіі совецкага кантроля маюць службовыя пасведчанні, а грамадскім кантролям будуць выдавацца ўсякі раз спецыяльныя пасведчанні, у якіх будзе ўказвацца аб'ект абследвання і на які тэрмін яны выданы.

Абвяшчаецца для ведама.

Нам. упаўнаважанага Камісіі совецкага кантроля пры СНК СССР па БССР **КАМЕНЕЎ.**



У Менску, у Доме партактыва, адкрылася усебеларуская швейная выстаўка. На здымку: наведвальнікі захапляюцца прыгожасцю і рознастойнасцю аддзела.

«ВУЧОНАЯ ПТУШКА» т. МАРГОЛІНА
(Глядзі заметку «Выдай і перві запіску»).

«То соломку тащит в ножках.
То пупок в носу несет...»

# „ВЫДАЙ... І ПАРВІ ЗАПІСКУ"

На торфазаводзе «Свабода», Асіпавіцкага раёна, працаўнікі ОРС'а займаюцца самаспажэннем і ашуканствам рабочых тарфянікаў. Варта заглянуць у панку, якая знаходзіцца ў краме, як можна ўбачыць рад запісачак па выдачу пайкоў сваім знаёмым і т. д. Вось некалькі характэрных з іх:

«КРАМА, ВЫДАЙ НА ДВА ЧАЛАВЕКІ КІЛОГРАМ МЯСА. КІЛОГРАМ МАСЛА, ДВА КІЛОГРАМЫ КАМСЫ.

Начальнік ОРС'а МАРГОЛІН».

Каму выдаць—невядома. Нават крамнік Блюмін і той не памятае, каму прадукты выданы па гэтай запісцы.

Яшчэ адна запіска.

«ТАВАРЫШ БЛЮМІН, ВЫДАЙ АДНУ ПАЧКУ ЧАЮ І ПАРВІ ЗАПІСКУ.

Начальнік ОРС'а МАРГОЛІН».

Колькі крамнік Блюмін парваў такіх паперак—невядома, ды ён і сам не памятае. Мы-ж ведаем, што работнікі ОРС'а сістэматычна п'янствуюць, мы ведаем таксама, што не так даўно загадчык склада ОРС'а Зіноўскі ўзяў ночу на складзе міску масла, хлеб і пашоў п'янствавацъ.

Не адстае ад начальства і крамнік Блюмін. Калі рабочыя прыгаравалі гаспадаркі Каваленка Ф., Прорвіч М. прышлі за пайком, то ён узяў з іх па 16 руб. 33 кап. а між тым кошт пайка—13 руб. 33 кап. Рабочыя, высветліўшы што Блюмін перабраў ад іх грошы, пачалі патрабаваць іх назад. Але ён доўга не аддаваў. І толькі тады, калі яны заявілі, што пойдуць скардзіцца ў партком, ён вярнуў ім перабраныя 6 руб. Такое-ж становішча мы маем і ў самой сталоўцы.

Пракурор Асіпавіцкага раёна павінен заняцца гэтай справай і НАСАДЗІЦЬ ЦЕПЛУЮ СЯМЕНКУ НА ЛАВУ ПАДСУДНЫХ.

ЯРЧАК.

# СПЫНІЦЬ РАСТРАТЫ

Дырэктыва 17 партыйнага з'езда аб зніжэнні розніцы ў цэн не знайшла свайго праламлення ў рабоце гандлюючых арганізацый, а, наадварот, «за апошні час у радзе клаперацыйна - гандлюючых арганізацый, як адзначала бюро ЦК КП(б)Б ад 8-VIII не толькі не аслабілі, але з новай сілай узмацніліся тэндэнцыі «нэпманскага духу» і неахайных адносін да спажыўца».

У вцебскім БАКТ'е (дырэктар Сіліцын) тэлефоны, якія ў Маскве прадаюцца ў розніцу па 130 руб., ён прадае па 219 руб., тады як фактычны кошт іх з рознымі налажэннямі не павінен перавышаць 173 руб. Вучэбная трохфазная дынама-машына каштуе з налажэннямі 370 руб., а ён прадае па 465 руб., і т. д.

Гав. Кагановіч адзначыў, што «гэтых ворагаў мы павінны даканаць не фразамі, не балбатнёй, не агульнай пастаноўкай пытання, а на справе. Іх трэба лавіць за руку ў магазіне, на складзе, на прадпрыемствах, у калгасе, паскарэла правяраючы хаванне тавараў, парадак водпуску, уліку і т. д.».

Між тым, мы назіраем рад выпадкаў недастатковай актыўнасці пасоўных судовых органаў, прызваных партыяй забяспечыць поўную ліквідацыю ўсякага роду злоўжываванняў і раскрадванняў. Так, пракуратура Заслаўскага раёна на працягу больш 2 месяцаў марыную справу растратчыкаў Гарачуна, растрацушага 7.896 руб., Зянько — 11.883 руб. А гэта катэгорыя спраў, згодна пастановы СНК СССР ад 16 лютага 1933 г., ад пачатку следства па вынясення прыгавора не павінна цягнуцца больш 20 дзён.

Мы маем і такое становішча, што па раду райспажыўсаюзаў (чырвона - слабодскі, лельчыцкі, заслаўскі і інш.), па судовых загадах не спаганяюцца растрачаныя сумы нават пры поўнай магчымасці іх спагнаць.

Па Чырвона-Слабодскаму раёну толькі па справах растратчыкаў Браткоўскага, Краснянскага і Азарбуша трэба спагнаць 12.000 руб.

У незабяспячэнні спагнання сум з растратчыкаў вінаваты ў першую чаргу следчыя органы, якія не заўсёды накладаюць арышт на маемасць абвінавачаных, і РС міліцыя, якая бяздзейнічае ў справе выканання прытаваораў парсудоў.

Зусім дрэнна пастаўлена работа па адшуканню растратчыкаў. У па адшуканню растратчыкаў Шчасцітка была вытэлефанавана растрата ў 7.513 руб. Пасля рэвізіі та ў 7.513 руб. Пасля рэвізіі Шчасцітка схаваўся. Міліцыя яго быццам шукала яго, а Шчасцітка знаходзіўся ў Смалявіцкім раёне. 25 мая г. г. Шчасцітка паступае на работу ў сельпо ў якасці прадаўца Смалявіцкага РСС, якое знаходзіцца за 25 кілометраў ад ранейшага месца яго работы, дзе за час з 25 мая да 1 чэрвеня 1934 года ён забраў з выручкі крамы 1.487 руб. і зноў схаваўся.

Побач з вывучэннем форм і метадаў раскрадванняў, арганізацыяй правільных судовых рэпрэсій вялікае значэнне набывае пытанне паладжвання работы кантрольна-рэвізійных камісій, якія павінны сістэматычна ў планавым парадку праводзіць рэвізію ўсёй гандлюючай сеткі клаперацый і дзяржгандлю.

Па прафілактычную дзейнасць, каб папярэдзіць раскрадванні БКС павінен звярнуць асаблівую ўвагу. Неабходна пакончыць з існуючай да гэтага часу бескантрольнасцю. Рад райсаюзаў па працягу некалькіх гадоў не рэвізаваліся. Праведзеная ў жніўні, відаць, за многа гадоў раз, рэвізія бягомльскага РСС выявіла «поўны развал» гэтага райсаюза, як канстатуе акт рэвізіі. Але прэзідыум БКС (ці не ў мэтах самастрахоўкі) знайшоў выхад са становішча і пастанавіў: прыцягнуць да крымінальнай адказнасці Казлова, Лосіка, Дзімешчанка, Шэвелева 1 інш. Усяго 10 асоб, з іх былых старшынь бягомльскага РСС 3 чалавекі.

Работнікам судова-следчых органаў партыя ўручыла такую вострую зброю барацьбы з класавым ворагам, зладзеям і жулікам, залежнымі ў гандлюючых арганізацыі, якою з'яўляецца рэволюцыйная законнасць і яна ўсім сваім астрыём павінна быць пазіравана на ахову грамадскай уласнасці. Гэта зброя павінна быць поўнасцю скарыстана для канчатковага знішчэння раскрадванняў у клаператыўна - гандлюючых арганізацыях.

ГОДЭР.

У Менску будуецца клуб Саюза буд аўнікоў. У ім будуць: зал для наведвальнікаў на 700 чал., фізкультурны зал, цір і цэлы рад пакояў для работы гурткоў. На здымку: Від пабудовы клуба

# СТЫЛЕМ АКАКІЯ АКАКІЕВІЧА

Калі гогалеўскаму Акакію Акакіевічу прапанавалі па гатоваму натэвічу прапанаваць, ён адкрыяку напісаць адносіну, ен адкрыяў напісаць: «Не, лепш дайце я перапішу» што-небудзь».

Прыкладна тое-ж адбылося і у рэдакцыі Жыткавіцкай газеты «Прыдакцыі Жыткавіцкай газеты «Прымежны комунар». Калі трэба было выступіць з артыкулам аб ахове калгаснага ўраджаю, там таксама сталі рыцца у старых газетных архівах і адтуль перапісваць.

Разлічваючы на забыўлівасць чытачоў, работнікі жыткавіцкай газеты відавочна не ўпадаючы дарам ты пісьма, рашылі «запазычыць» што копьек з другіх газет. І запазычылі. Праўда, даты выхаду нумараў не супадаюць усяго толькі на адзін год і некалькі дзён. Але што да гэтага жыткавіцкім журналістам? Важна, каб не было больш памастацку ды памацней.

Ітак, адкапаўшы ў пыльных рэдакцыйных архівах камплект тураўскай газеты «ЧЫРВОНАЯ ТУРАЎШЧЫНА», яны наштурхнуліся на 81 нумар газеты за 1933 год, дзе была змешчана справаздача аб праведзеным рэйдзе па ахове ўраджаю.

Не будзем удавацца ў ацэнку мастацкага боку гатага «нарыса», укажам толькі, што яго «мастацкія» якасці пайшлі не далей звычайных цыркуляраў.

Так у тураўскай газеце ў 1933 годзе быў змешчан артыкул пад загалоўкам «Пільна ахоўваць ураджай».

У 1934 годзе ў жыткавіцкай газеце быў таксама змешчан на гэту тэму артыкул «Стой! Хто ідзе»!

І ў першым, і другім выпадку гутарка ідзе аб ахове ўраджаю, паказваюцца вынікі рэйдэ.

Нас зацікавіла вельмі падазронае супадзенне думак і абзацаў. І аказалася, што ў Жыткавічах пішуць акуратна так, як год назад у Тураве. Возьмем хоць-бы пачатак артыкулаў.

У тураўскай газеце:

«Хвалюецца калгаснае збожжа, але лікі ўраджай гэтага года прыводзіць у бешаную ярасць класавага ворага».

У жыткавіцкай змянілі толькі два словы: замест «бешаную ярасць» напісалі «шалёную злосць».

У наступным абзацы тураўскай газеты гаворыцца:

«Сігналы аб першых выпазках класавага ворага ўпарта патрабуюць арганізацыі ўзмацнення работы па ахове грамадскай уласнасці. Зараз патрабуецца велізарная пільнасць усёй масы чэсных калгаснікаў, патрабуецца бязпітасная суровая барацьба з раскрадваннямі і арганізатарамі гэтых раскрадванняў».

У Жыткавіцкай газеце напісана:

«Гэтыя першыя сігналы аб выпазках класавага ворага ўпарта патрабуюць і павінны паслужыць урокам для добрага і ўважлівага умацавання і адносін да работы па ахове калгаснай уласнасці. Зараз патрабуецца надзвычайна шчырая вялікая пільнасць усіх чэсных калгасных мас да аховы ўраджаю».

Чытачу нецікава, зверыўшы гэтыя дзве цытаты, устанавіць іх першакрыніцу.

Далейшыя абзацы таксама падобны адзін на другі, як дзве кроплі вады.

Але што сапраўды дзівосна, дык гэта поўнае «перанясенне» не толькі форм, але і метадаў работы.

У 1933 годзе ў Тураве рэйд пачалі з таго, што ў тры гадзіны ночы сталі правяраць МТС і знайшлі там спячым вартаўніка.

У 1934 годзе ў Жыткавічах, як піша газета, «прыблізна а трацяй гадзіне накіраваліся праверыць вартавога МТС» і..... таксама знайшлі спячым вартаўніка.

Дзіўнае супадзенне. Мы дапускаем, што спалі вартаўнікі, дапускаем што былі і рэйды. Але ніяк не можам дапусціць, каб гэтыя два артыкулы пісаліся рознымі людзьмі.

Тут, як нам падказвае логіка, у Тураве пісалі, а ў Жыткавічах, скарыстоўваючы багаты вопыт Акакія Акакіевіча, займаліся перапісваннем.

Пара, даўно пара намесніку рэдактара жыткавіцкай газеты ЯСТРЭМСКАМУ моцна падумаць аб тым, каб пачаць і самому сёе-тое пісаць.

Д. А.

# Штодзеннае кіраўніцтва і дапамогу калгаснаму і брыгаднаму парторгу

*(Да вынікаў месячніка абмену вопытам калгасных і брыгадных парторгаў)*

Праведзены месячнік абмену вопытам работы калгасных і брыгадных парторгаў зусім дома паказаў своечасовасць і необходнасць абмену вопытам партыйнай работы. Больш двух дзесяткаў парторгаў перадавых калгасаў у сваіх выступленнях на старонках «Звязды» і сотні парторгаў у раённым і калгаднасельскім друку паказалі лепшыя прыклады палітычнага ўздзеяння на масы калгаснікаў, іх перавыхавання.

На прыкладах работы парторгаў — Гульнов'ча (Слуцкі раён), сельнікава (Аршанскі раён), Якаўлева (Магілёўскі раён) сотні парторгаў БССР пераканаліся ў тым, што сістэматычная работа парторганізатара з актывам вышэйшае поспех работы парторгаў, вялікае ў сістэму работы парторганізатара актыва на з'яўленню важнейшых пытанняў калгаснай вытворчасці, практыка індывідуальных заняткаў актыва, вывучэнне арганізатараў на жнярабоце — гэта вучыць актыў, у штодзённай рабоце высоўвае новыя кадры актыва, выхоўвае адказнасць, ініцыятыву за агульна-калгасную работу і аблягчае работу партыйнага арганізатара.

Іменна ў гэтым і сіла первічнай парторганізацыі. «Не трэба пераацэньваць тым, што некаторыя калгасныя партыйныя арганізацыі нематлікі. Сіла іх павінна заключацца не ў шматлікасці, а ў кіраўніцтве беспартыйным актывам, яго згуртаванасці вакол нематлікай калгаснай первічнай парторганізацыі, у яго згуртаванасці вакол партыйна-комсамольскай групы, або вакол адзіночак комуністаў» (Кагановіч).

Парторг павінен памятаць, што з ліку калгаснага актыва неабходна стварыць групу спачуваючых, таму вывучэнне кожнага актывіста калгаса, клопаты аб вучобе актыва, аб палітычнай яго ўзбросанасці павінны заняць адно з асноўных месц у рабоце парторга.

У выступленні парторгаў перадавых калгасаў (**Башкоў, Сапега, Валодзька** і інш) мы бачым, што **добрая арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва,** як, чырвоныя і чорныя дошкі, чырвоныя і рагожныя сцяжкі, вакол якіх вядзецца барацьба калгасных брыгад, кароткія штодзённыя нарады ў брыгадах на абмеркаванню вынікаў работы за дзень і планаў на заўтра, заахвочвала калгаснікаў у рабоце, падцягвала адстаючых на ўзровень перадавых і калгас своечасова спраўляўся з усімі сельска-гаспадарчымі кампаніямі. Тут роля парторга асабліва вялікая. Ён павінен штодзенна кіраваць гэтай справай.

На прыкладах работы парторгаў гэтых калгасаў мы бачым, як грамадскае ўздзеянне на адстаючых у рабоце калгаснікаў дапамагала ім выйсці ў рады перадавых.

Толькі перанясенне цэнтру нажару партыйнай работы ў брыгаду, звяно—вырашае поспех работы калгаса. Іменна ў камбінаваных звеннях вакол **машын**—малатарні, мяла, трактарных брыгадах (у залежнасці ад характару работы) павінна канцэнтравацца партыйна-масавая работа.

— Агульныя сходы калгаснікаў склікаем у рэдкіх выпадках. Напрыклад, па пытаннях будаўніцтва ў калгасе, выкарыстання калгасных сродкаў, зацвярджэння плана ўборкі, сяўбы і інш. Усе вытворчыя пытанні і масавая работа перанесены ў брыгаду, звяно — гаворыць парторг калгаса «Гігант» **Булаеў,** Чэрыкаўскага раёна.

І гэта безумоўна дае магчымасць больш канкрэтна і аператыўна вырашаць вытворчыя пытанні, узмацаць адказнасць комуністаў-калгаснікаў за работу брыгады, дае магчымасць лепш вывучаць людзей.

У выступленнях парторгаў мы таксама бачылі сілу **нізавога друку.**

— Калі пра брыгаду № 12 — брыгадзір Кісрасіраў Андрэй — было напісана ў газеце, што яна выходзіць на работу ў 8-9 гадзін, то пазаўтра брыгада вышла на работу ў 4 гадзіны раніцы — піша парторг калгаса імя Чарвякова **Вараб'ёў** (Мсціслаўскі раён).

Такія прыклады не адзіныя. Партыйны арганізатар павінен кіраваць нізавым друкам, клапаціцца аб тым, каб брыгадныя газеты выходзілі рэгулярна, каб матэрыял іх быў дзейсным.

Палітычная свядомасць калгаснікаў расце. Сёнешні калгаснік хоча ведаць аб палітычных падзеях краіны Совецкаў і капіталістычных краін, таму **абавязак парторга, шляхам гутарак, чытак дапамагчы калгаснікам разабрацца ў палітычных падзеях, ахапіўшы большэвіцкім палітычным уздзеяннем шырокія масы калгаснікаў.**

**Асаблівую ролю ў рабоце парторга адыгрывае метад асабістага ўздзеяння, чулага падыходу парторга да кожнага калгасніка ў паасобку.** Быў час,—гаворыць парторг калгаса «Парыжская Комуна» **Якаўлеў** (Магілёў), калі Вараб'ёў лічыўся першым тультаём у калгасе. Не раз збіваў коней і іншае. Я з ім гутарыў, давіў яму зрагумець, як ён стаміў, недобрасумленнымі адносінамі да працы паходзіць агульна-калгасная справа. І Вараб'ёў стаў лепшым калгаснікам. Ён не атрымаў ні аднаго адміністрацыйнага спагнання. А толькі пасля кожнага выпадку дрэннай работы з ім асабіста гутарылі.

**Толькі індывідуальным, чулым падыходам, грамадскім уздзеяннем на факты недобрасумленных адносін калгаснікаў да работы можна перавыхаваць адсталую частку калгаснікаў. Аб гэтым павінен памятаць кожны партыйны арганізатар.**

Рад парторгаў, з'яўляючыся адначасова старшынямі калгасаў і партыйнымі арганізатарамі, часта забываюць асноўнае — масава-выхаваўчую работу. Адрыў палітыка-выхаваўчай работы ад гаспадарчых функцый старшыні калгаса, захапленне апошнімі функцыямі—вялікая пагроза ў рабоце парторга — старшыні калгаса. Іменна спалучэнне гэтых функцый і ў першую чаргу метады грамадска-палітычнага ўздзеяння павінны легчы ў аснову работы парторга.

Нельга забываць і аб рабоце **сярод аднаасобнікаў.** У гэтай рабоце парторгу павінен дапамагчы калгасны актыў. Неабходна памятаць, што сёнешні аднаасобнік — гэта заўтрашні калгаснік, і чым лепш парторг, актыў калгаса будуць працаваць з кожным аднаасобнікам асабіста, тым хутчэй ён стане ў рады калгаснікаў.

Паказаныя ў часе месячніка асобныя факты добрай арганізацыі партыйна-масавай работы павінны стаць здабыткам усіх парторганізатараў калгасаў і брыгад.

У гэтай рабоце парторгам абавязаны дапамагчы раённыя газеты, раённыя камітэты партыі ў першую чаргу. Ажыццявіць пастаўленыя XVII з'ездам партыі задачы ўзняцця арганізацыйнага пытання да ўзроўню палітычнага кіраўніцтва можна толькі пры штодзённай сістэматычнай дапамозе ў рабоце первічным парторганізацыям.

Але ёсць яшчэ такія райкомы партыі і райгазеты, якія недаацанілі ўсёй важнасці абмену вопытам работы парторгаў, а значыць і дапамогі ім у разгортванні партыйна-масавай работы. Зусім абышлі мяўчаннем і яе палічылі нават патрэбным уключыцца ў месячнік абмену вопытам, які быў абвешчан ЦК КП(б)Б, політсекторам Наркамзема і газетай «Звязда», такія газеты як **кармянская, рагачоўская, жлобінская, полацкая, рэчыцкая, стара-дарожская і пухавіцкая.** Гэтыя газеты на працягу жніўня не знайшлі месца на сваіх старонках ні для аднаго парторга.

А можа рэдактары гэтых газет і райкомы партыі думаюць, што перабудова партыйнай работы на аснове рашэнняў XVII з'езда партыі ўжо закончана? Калі так, то яны глыбока памыляюцца, сапраўдная перабудова партработы на аснове рашэнняў XVII з'езда партыі не адбываецца ў адзін-два месяцы. Патрэбна настойлівая пратлівая работа ў першую чаргу партыйных кіраўнікоў, для таго, каб сапраўды падцягнуць арганізацыйную работу первічных парторганізацый да ўзроўню палітычных задач.

З вопыта работы асобных парторгаў мы бачым, што раней адстаючыя калгасы, у якіх зараз добра арганізавана партыйна-масавая работа, выйшлі перадавымі ва ўсіх сельска-гаспадарчых кампаніях гэтага года.

Таму абавязак раённых газет сістэматычна на сваіх старонках даваць слова калгасным і брыгадным парторгам, каб лепшыя прыклады работы перадавых зрабіць здабыткам адстаючых.

Ні адзін парторг у сваім выступленні не сказаў, аб тым, як ён працуе над узняццём свайго палітычнага ўзроўню. А гэта дае нам права зрабіць вывад, што пытанне вучобы партыйнага арганізатара пастаўлена не зусім добра.

**Партыйны арганізатар,** які павінен аператыўна даводзіць да шырокіх мас калгаснікаў пастановы партыі і змагацца за іх адыцдавых комуністаў, — **абавязан у першую чаргу сам аўладаць марксісцка-ленінскай тэорыяй.** І ў гэтым парторгу павінны дапамагчы раённыя камітэты партыі.

**Асаблівая ў штодзённай рабоце парторгу павінен дапамагаць інструктар райкома.** Інструктар павінен быць інициатарам дапамождавых адстаючым шляхам куставых нарад парторгаў, штодзённай дапамогі ў арганізацыі работы парторга. Ён павінен дапамагчы парторгу згуртаваць калгасны актыў, палітычна ўзбраіць на масы калгаснікаў, арганізаваць яго асабістую вучобу.

А. ВОЛЬНЫ

## Прывітанне маці

У Заходняй Беларусі маці, даведаўшыся, што яе сын зарабіў грошы праз штрэйкбрэхерства, кінула гэтыя грошы ў печ.

(З газет Заходняй Беларусі).

Веру, тую, маці ажыве ў паданнях
Рукі слоў абдымуць ласкаю нязвыклай...
Нат з радкоў газеты я пачуў паўстанне
І разгледзеў сэрца у тузе вялікай...

І разгледзеў хатку, дзе адна пад клёнам
Маці ўсё пільнуе, шчасце мо' прыблудзіць,
Покуль песнай з сэрца выпне паціху
Тое, што было ў ім,—тое ў ім, што будзе.

Так жыве звычайна ў хустачцы з саломы
Хатачка старая,—дробная, як вулей,
З гэтай хаткі дзеяй,—мо' і несвядома
Рапартуе сэрца,—сэрца нам матулі.

...Веру, тую, маці ажыве ў паданнях...
Рукі слоў абдымуць ласкаю нязвыклай...
...З вольнае старонкі шлю я прывітанне
Хатцы той маленькай, маці той вялікай.

## Аб дапушчэнні НКСнабам і Белкаапсаюзам скажэння па ўстанаўленню цэн на плодагародніну

*Пастанова Совета Народных Камісараў БССР*

Совет Народных Камісараў БССР адзначае:

Канвенцбюро НКСнаба парушыла дырэктыву Саюзнаркамснаба ад 16-VII-34 г., устанавіўшы на рад відаў плодагародніны цэны вышэй рыначных (капуста, гуркі), несвоечасова ўстанавіла цэны на некаторыя віды плодагародніны (арбузы). Паказанае выяўляе, што НКСнаб слаба кіраваў сваім канвенцыйным бюро, якое павінна займацца рэгуляваннем цэн на рынку. Менскі Гарснаб, атрымаўшы ўстаноўленыя на гародніну цэны, спусціў іх са значным спазненнем, у выніку чаго гандлюючыя арганізацыі прадаўжалі пасля 1-VIII продаж гародніны па павышаных цэнах.

Праўленне МЦРК не забяспечыла своечасовага ўвядзення новых цэн на гародніну з 1-VIII, не гледзячы на тое, што новыя цэны былі яму вядомы.

Старшыня прэзідыума БКС т. Баскін сваёй пастановай ад 16-VIII-34 г. № 387, п. 4, абзац 2-гі ўстанавіў рознічныя цэны на гародніну прыгарадных гаспадарак вышэй цэн канвенцбюро, чым па сутнасці парушыў дырэктывы камзаг СНК і Цэнтрасаюза, таксама парушыў совецкія законы, якімі ўстаноўлен парадак устанаўлення цэн на плодагародніну.

Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Указаць нам. наркамснаба т. Кладавікову на адсутнасць належнага кіраўніцтва работай канвенцбюро. А ўсяму складу канвенцбюро Наркамснаба абвясціць вымову.

2. Прапанаваць тав. Гурэвічу:

а) забяспечыць выкананне дырэктыў НКСнаба СССР ад 16-VII-34 г. аб тым, што канвенцыйныя цэны не павінны быць вышэй рыначных цэн;

б) устанаўляць своечасова цэны на ўсю плодагародніну, пастаўчую для рэалізацыі ў гандлюючую сетку БССР.

3. Даручыць горсоветам і РВК устанавіць пастаянны нагляд за работай гарайснабаў і забяспечыць своечасовае павядзенне ўстаноўленых цэн да нізавой гандлёвай сеткі і правільнае іх ажыццяўленне.

Прапанаваць менскаму горсовету накласці строгае спагнанне на інспектара гарснаба т. Любошыца за бяздушныя адносіны да сваёй працы, што прывяло да несвоечасовага давядзення ўстаноўленых цэн на гародніну да гандлёвай сеткі і тым самым парушыла парадак снабжэння рабочых гародніной.

4. Прапанаваць старшыні прэзідыума БКС т. Баскіну:

а) адмяніць 2-гі абзац п. 4 сваёй пастановы за № 387 ад 16-VIII - 34 г. «Аб устанаўленні цэн на бульбу і гародніну прыгарадных гаспадарак», бо гэта ёсць перавышэнне сваіх правоў і незаконнае павышэнне цэн на гародніну;

б) продаж гародніны прыгарадных гаспадарак гандлюючымі арганізацыямі праводзіць па цэнах, устаноўленых канвенцбюро пры НКСнабе.

в) работнікаў праўлення МГРК, якія не забяспечылі своечасовага ўвядзення ў жыццё з 1-VIII-34 г. новых цэн на гародніну, прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці.

5. Папярэдзіць старшыню прэзідыума БКС т. Баскіна аб недапушчальнасці выдання ім пастаноў, супярэчачых дырэктывам Цэнтрасаюза і камзаг СНК.

**Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.**

**Нам. кіраўніка спраў СНК БССР І. ПЯТРОВІЧ.**

31 жніўня 1934 г.

Разгорнем усебеларускае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку жывёлы да зімоўкі

## КОЖНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ ФЕРМЕ — МОЦНУЮ КАРМОВУЮ БАЗУ

*(Пісьмо работнікаў МТФ калгаса „Чырвоныя ўсходы", Аршанскага раёна)*

У гэтым пісьме мы хочам расказаць усім таварышам калгаснікам і калгаснічкам, працуючым на фермах, як мы ўлічваем прадукцыйнасць нашай фермы і галоўнае, аб тым, як наша жывёла забяспечана кармамі на зіму.

Наша жывёла выйшла на вясну гэтага года гладкая, вышэй сярэдняй упітанасці. Кармы эканомілі, выдавалі па строгіх нормах.

Роўна ў 2 гадзіны 30 мінут ночы пачынаецца раніцняя дойка, у 4 гадзіны каровы выганяюцца на пашу. Апаўдня прыходзяць, у 12 гадзін даюцца і ў 3 гадзіны выганяюцца зноў. Вечарам прыходзяць у 9 гадзін. Пастухом у нас працуе ўжо чацверты год лепшы калгаснік **Сазонаў Янка**, які любіць жывёлу і зімой таксама даглядае яе.

У выніку такога дбайнага догляду каровы ў сярэднім даюць 8 літраў малака ў дзень, а некаторыя і 10 літраў. За дзень з 46 кароў надойвалі да 400 літраў малака. Гадавы план малакопаставак дзяржаве ў 21450 літраў мы перавыконваем выканалі да 8 жніўня. Цяпер лішкі прадаем на калгасным базары.

Зараз рыхтуемся да зімы. Улічваем кожны кілограм корму, дакладна размяркоўваем, каб хапіла на сытую зімоўку нашай жывёле. А МТФ наша расце шпарка. За год стада павялічваецца на 50 процантаў.

Робячы нашы падлікі, мы не забылі, што ў калгаснікаў ёсць 58 кароў і 3 цёлкі (бескароўных ужо няма), апрача таго ёсць абагуленыя 32 авечкі, 39 коней ды 6 жарабят.

Дык вось як мы разлічылі накарміць сыта і па нормах (па рацыёну) ўсю калгасную і калгаснічкую жывёлу.

Сена з першага ўкосу мы сабралі 1920 цэнтнераў, з другога ўкосу возьмем не менш 230 цэнтнераў. Значыць будзе ўсяго 2150 цэнтнераў.

Сіласу з праполатага зелля закладзі 60 тон; з бульбоўніку, капусніку, лісця, бручкі і буракоў закладваем ямчэ 240 тон. Значыць будзе ўсяго 300 тон.

Саломы жытняй і шпанічнай з 85 гектараў атрымаем 1099 цэнтнераў, яравой з 86 гектараў атрымаем 860 цэнтнераў і мяхіны каля 500 цэнтнераў. Усяго 2459 цэнтнераў.

Буракоў у нас мала, усяго 0,75 гектара — ураджай 120 цэнтнераў, бручкі больш 4,5 гектара — 9.36 цэнтнера: усяго 1056 цэнтнераў.

Гэта грубыя і сакавітыя кармы. Па вопыту мінулага года калгас бранёруе для МТФ канцэнтраты і бульбу.

З чаго і як будзе складацца кармовы рацыён нашай жывёлы і на які перыяд?

Разлік такі: сена дойным каровам і нецелям (65 штук) па 2,5 кгр. — 292,5 цэнтн.; 17 гадавікам па 2 кгр. у дзень — 61,2 цэнт.; сяголеткам (40 галоў) па 4 кгр.— на круглы год 288 цэнтн.; быкам па 4 кгр. канцэнты—21,60 цэнт. і авечкам па 1,5 кгр. — 72 цэнт. (для авечак у нас загатоўлена 10 цэнт. лісцевага корму). Усяго, такім чынам, для МТФ патрэбна 735 цэнт. сена. Для 45 коней (па 12 кгр. у дзень, на 200 дзён) патрэбна 1080 цэнтн. Для калгаснічкіх кароў астаецца 335 цэнтн. сена, або ў сярэднім па 5,5 цэнт. на карову.

Сіласу ў нас хопіць, як і летась як для калгасных, так і калгаснічкіх кароў. Норма — 10 кгр. у дзень.

Салома размяркоўваецца так: калгасным каровам і нецелям (па 6 кіло), гадавікам па 4 кіло, быкам па 5 кіло—ўсяго 851 цэнтн., каровам калгаснікаў — 325 цэнтн. Разам 1176 цэнт. На падсціл астаецца звыш 800 цэнтн. жытняй саломы.

Мяхіна будзе скарыстана, як і летась, у запараным выглядзе.

Канцэнтраты скарыстоўваюцца па норме ў 200 грамаў на карову: цялё ў дзень. МТФ атрымлівае: на дарослых па прадукту 100 дзён (узмоцненае кармленне за 1 месяц да ацёлу і 2.5 месяцы пасля ацёлу) — 17 цэнт.; для цялят (40 галоў) па круглы год 29,6 цэнт. плюс ільнанасенне (100 грамаў у дзень) — 14,8 цэнт.

Як мы гаварылі вышэй, МТФ атрымлівае і бульбу (норма на дарослую карову — 3 кіло ў дзень, цялятам — 1,5 кгр.) Бульба, як і сілас, даецца дойным каровам толькі пасля ацёлу. Тое самае з буракамі.

Цяпер ямчэ аб адным важным моманце. Як вядома, жывёла ў аднаасобніку была простая, як кажуць «трошку белая, трошку чорная». Мы паставілі задачу — у бліжэйшы год-два падабраць на ферме народзістую жывёлу.

Як мы гэта робім? Вельмі проста. Ёсць у нас два быкі «швіцы» і 1 чырвоны. Імі пакрываем простых кароў. Цяляты нараджаюцца палепшаныя. Так і падбіраем найлепшых цялят, гадуем іх. Ужо маем кроўных 25 нецелей і цялят сівых «швіцаў» і чырвоных «германак». Праз два гады ўсё стада будзе народзістым.

Лахматых «буронушак», якія даюць па 2 літры малака ў дзень, хутка не будзе і ўнаміце.

Вось наш вопыт і нашы дасягненні. Змагаемся за новыя перамогі. Усе МТФ Совецкай Беларусі выклікаем на соцыялістычнае спаборніцтва на забеспячэнню фермы кармамі і разгортванню жывёлагадоўлі.

Прапануем абвясціць усебеларускі агляд падрыхтоўкі фэрм да зімоўкі.

**Старшыня калгаса «Чырвоныя ўсходы» ПАЎЛАЎ П.**

**Загадчык МТФ М. ЛЯШНЕЎСКІ.**

**Пастухі: ІЯ. САЗОНАЎ, ВАСІЛЬ ЦЫГАНКОЎ, ІВАН БАЦЮКОЎ.**

**Даяркі: ГАННА ЦІТОВА, ПЕЛАГЕЯ ЛЯВОНАВА, НАСТА ВАСІЛЕНКА, ПЕЛАГЕЯ ІШУТКОВА.**

**Цялятніцы: АКСІННЯ БАЦЮКОВА, ДОМНА ВАСІЛЕНКА.**

Даяркі калгаса «Чырвоныя ўсходы» з ручнікамі, у халатах. Старшыня калгаса «Чырвоныя ўсходы» ПАЎЛАЎ.

## ПІСЬМЫ рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ БАБРУЙСКАГА РК КП(б)Б Т. МІЛЛЕРУ

### ПРАЎЛЕННЕ КРАДЗЕ КАЛГАСНАЕ ДАБРО

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

Калгас «СВЕТ», Баравіцкага сельсовета (БАБРУЙСКІ РАЁН), засмечан класава-варожымі людзьмі: Парторг МАКАРАЎ і старшыня калгаса ПІНЧУК крадуць калгаснае дабро. Пядаўна перадалі загадчыцы ясляў МІКУЛІЧ 1.172 кілограмы жыта, у той час, як калгаснікі не атрымалі поўнасцю хлеба за працадні.

Ураджай мінулага года гэтыя кулацкія прыслужнікі паразвозілі на вёсках і цяпер прадаюць на рынку, хаваючыся ад нас.

Просім газету «Звязда» дапамагчы нам вызваліцца ад гэтых ворагаў социялістычнай гаспадаркі.

**ПАЦЭНАК М., ГАЛІМСКІ, ПАРХАНОВІЧ, ГАЙТКЕВІЧ і яшчэ 7 подпісаў.**

СТАРШЫНІ ДЗЯРЖЫНСКАГА РВК Т. ВАНСОЎСКАМУ

### ВЫВЕСЦІ ЗАВОД З ПРАРЫВУ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

Крэйдаванавы завод «Дзяцільна» (Дзяржынскі раён) па плану на 1934 г. павінен здабыць 9420 тон крэйды-сыравіны. За 7 месяцаў здобыта толькі 1317 тон. На молатай крэйдзе гадавы план у 2 тысячы тон выканан толькі на 47 проц. Вапны выпрацавана 205 тон замест плана ў 2400 тон.

Ніякай культмасавай работы з рабочымі не вядзецца. Насценгазета не выходзіць (апошні нумар выйшаў к першаму мая). Соцспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута. Старшыня заўкома **Якубовіч** і дырэктар завода **Кантар** не ведаюць, колькі ёсць на заводзе ўдарнікаў.

Дрэнныя бытавыя ўмовы рабочых (бруд у інтэрнаце, нізкая якасць абедаў у сталоўцы, несвоечасовая выплата грошай рабочым) павялічван цякучасць рабочай сілы.

**КАЗАКЕВІЧ.**

САКРАТАРУ СМАЛЯВІЦКАГА РК КП(б)Б ТАВ. КУДМАНУ.

### КУЛАКІ ЗАСЕЛІ У КАЛГАСЕ „ПЕРАМОГА"

(ПІСЬМО СТУДЭНТА)

У калгасе «Перамога», Амяльнаўскага сельсовета (Смалявіцкі раён), кулакі знайшлі сабе прытулак. Паўлоўскі—былы кіраўнік маёнтка, Залівака—былы арандатар, Мехедка Пілип таксама былы арандатар.

У калгасе ёсць малочна-таварная і свінатаварная фермы. На фермах няма пастаянных работнікаў, дрэнна даглядаецца жывёла.

У выніку гэтага за адно паўгодзе пала 7 кароў і 60 парасят. У калгасе адсутнічае эдэльшчына. З часу арганізацыі калгаса ні разу не было рэвізіі.

Калгаснікам да гэтага часу не выдалі аблігацый «пяцігодка за чатыры гады».

**РАЖАНСКІ**

НАРКОМУ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ТАВ. СУРТА.

### СТВАРЫЦЬ НАЛЕЖНЫЯ УМОВЫ ДЛЯ ХВОРЫХ

(ПІСЬМО АДНАЧЫВАЮЧАГА)

У Боркавіцкім санаторыі адсутнічае належны догляд за хворымі. Галоўурач тав. **Берковіч**, ён-жа і дырэктар санаторыя, ніколі не бывае сярод хворых і не дае ўказанняў аб рэжыме для кожнага з іх.

Нядобранаснай і ў антысанітарным выглядзе падаецца страва для хворых, у выніку чаго 12 жніўня 1934 года былі масавыя страўнікавыя захворванні. Да рэчы, Берковіч тлумачыць гэта тым, што тлусты суп, або дрэнна складзена меню. Адсутнічае і культурнае абслугоўванне, у ленінскім кутку няма стала і крэслаў. Газет выпісваецца ўсяго 5 экземпляраў на 40 хворых.

**І. С. СМОЛЬСКІ.**

ПРАКУРОРУ МАЗЫРСКАГА РАЁНА т. БАРКАНУ.

### САМАЧЫНЦА КРЭКА СТРОГА ПАКАРАЦЬ

(ПІСЬМО ЗАГАДЧЫКА АДДЗЕЛА СУВЯЗІ)

23 жніўня загадчык агенцтва сувязі Дуліцкага сельсовета, Мазырскага раёна, **Цімохаў** знаходзіўся на службе. Старшыня сельсовета т. Ісэн, карыстаючыся адсутнасцю Цімохава і яго жонкі, якая працавала ў калгасе, зламаў у дзверах замок, выкінуў на двор усю маемасць, у тым ліку паштовую, каб забраць сабе кватэру. Прапала большая палова рэчаў, бо іх ніхто не вартаваў. Адной толькі паштовай маемасці прапала на 121 руб.

**МАРГУНОЎ.**

**АД РЭДАКЦЫІ:**

«Звязда» патрабуе ад Мазырскага райпракурора неадкладнага ўмяшання ў гэту справу і прыцягнення да самай суровай адказнасці парушальніка рэволюцыйнай законнасці.

*ПА СЛЯДАХ ПІСЕМ*

### „ПРАЙДОХА У КІРАЎНІЦТВЕ КАЛГАСА"

**На змешчанае ў «ЗВЯЗДЗЕ» 26 ліпеня пісьмо «Прайдоха ў кіраўніцтве калгаса» Камарынскі РК КП(б)Б паведамляе, што ФАКТЫ ПАЦВЕРДЗІЛІСЯ.**

**Рашэннем бюро райкома ПІСКУНОЎ знят з работы старшыні калгаса імя Розы Люксембург, і справа перадана следчым органам. Пытанне аб яго партыйнасці будзе вырашана пасля заканчэння следства.**

ЭДУАРД САМУЙЛЁНАК

## НАСУСТРАЧ СОНЦУ

Яны не былі здольны лятаць. Я ўжо не гавару аб тым, што яны не маглі ваяваць.

Так гаворыць тав. **Кароль**, камандзір №-скай авіябрыгады.

Я прыпамінае тое, што асталося далёка ззаду, тое ганебнае і страшнае мінулае, аб якім цяжка ўспомніць. У 1914 годзе ма'ізаваны ў царскую армію, як рабочы слесар, тав. Кароль, трапіў у авіячасць на фронце і, працуючы ў майстэрнях, набыў кваліфікацыю матарыста. Ён быў неадлучна пры самалёце, ён бачыў нельмі многіх пілотаў-афіцэраў рускай армії. Ён расказвае:

— ...Яны баяліся нават лятаць. Памятаю такі выпадак: калі мы стаялі каля цытадэлі Асавец, адзін афіцэр лятаў на разведку. Па заданню штаба ён павінен быў пранікаць у тыл ворага, выводзіць распалажэнне часцей, месцазнаходжання артылерыі і інфармаваць штаб. Ён выходзіў апраніты ў мяккае скуранае палто з вялізным футровым каўнярам. Ён быў увесь перавязан рамнямі. Шлем, акуляры, карта, сумка... Ён ні на каго не глядзеў, і на яго баяліся салдаты зірнуць. Чорт, не чалавек...

Камандзір Кароль усміхаецца.

— ...але як даходзіў ён да машыны, прападала добрая палова фэрсу. Можна сказаць, ён так баяўся сваёй машыны, як салдаты баяліся яго. Ён ніколі не ўзнімаўся вышэй за 50 метраў. Ехаў на самалёце, як на аўтамабілі — калі сустракалася ўзгор'е, то ён узнімаўся на ўзгор'е і зараз-жа прападаў у даліне, каб зноў узлезці на горку. Лінію фронта ён не пералятаў. Варочаўся назад.

— А данясенне?

— А данясенне пісаў пісар. Скажам: там і там — артылерыя, там — вялікае злучэнне пяхоты, там — разведчык заўважыў кавалерыю. Загадаюць пісару—ён піша. І гінулі тысячы людзей з-за п'яніцы і баязліўца...

От яно, тое страшнае. Рухаліся ўслепую палкі, проста пад смертаносныя сляпцовыя смерчы кулямётаў, пад ураганны агонь артылерыі. А пілоты-разведчыкі п'янствавалі бесправудна па шкіталях і інтэнданцтвах, выляталі для таго, каб асвяжыцца, разбівалі машыны і атрымлівалі ўзнагароды і падзякі «за праяўленне асабістай ініцыятывы і волі пры катастрофе».

Маленькі факт з успамінаў. Цяпер гэта толькі гістарычная дэталь, якая асвятляе ў мутным, крывавым змроку мінулага сусветнай бойні зацягнутыя ў афіцэрскія мундзіры сілуэты трусліўых злачынцаў.

Камандзір устае. Ветлівы гэст:

— Я пазнаёмлю вас с людзьмі нашай авіяцыі.

***

На ўзлёт ідзе машына. Віхрыць у бляску прапелер. Прыўзнятыя крыллі, здаецца, трымаюць пад ніскам паветраных струменняў. Самалёт набірае найвялікшую хуткасць, адрываецца ад зямлі абсалютна непрыкметна. От ён ужо робіць разварот, бярэ курс і аддаляецца. І да самае гэтае пары не спускае з яго вачэй тав. **Кароль**. Ён стаіць на старце, побач з ім начпалітаддзела т. **Маслоў** і начальнік штаба т. **Лазавой**.

Адна за аднэй узлятаюць машыны. І кожная з іх прахоладзіць міма гэтае маленькае групы—мазга вялікай крылатай стаі. Маленькі, амаль непрыкметны недахоп, мізэрная няўтокласць узлёту, мікраскапічная памылка — і лётчык павінен будзе паўтарыць аперацыю.

Камандзіры звяна **Вяроўка** і **Серэнка** — яны лятаюць так, як бы крыллі самалёта ёсць іх уласныя крыллі. Ніводнае паломіці за ўвесь час іх лётнае работы. Экіпажы самалётаў іх звяноў працуюць бездаганна. Гэта знатныя людзі часці, узор для ўсіх, ідэальны паказальнік высокай волі, большэвіцкай арганізаванасці. І ўсё-ж калі хто з іх зробіць найменшую з усіх пунктаў поглядаў памылку, яму будзе загадана звярнуцца на зямлю. І лётчык, як зучань, будзе паўтараць тую ці іншую аперацыю, пакуль камандзір скажа:

— Ну, цяпер нічога. Гэта пасапраўднаму.

Такім толькі шляхам людзі могуць пераняць большэвіцкі стыль.

***

Уражлівыя і нявопытныя людзі па меры магчымасці стараюцца здабыць як мага большую дозу рамантыкі.

— Слухайце. А ў вас часам не было, скажам... пажара на самалёце? От, вы ляціце на аграмаднай вышыні, і раптам полымя вырываецца з матора...

Лётчык мякка адказвае.

Я аб такіх выпадках і не чуў. Праўда, у газетах сустракаюцца паведамленні. Дык гэта за мяжой... У іх, ведаеце, джынгоўка. Рэкламы... рэкорды... Што-ж датычыць мяне самога, то ў мяне, ведаеце за чатыры гады і шрубік адзін не згубіўся.

— Ну, а так, скажам, вымушаная пасадка... От вы ляціце на аграмаднай вышыні, і раптам тр-рах... Нешта адарвалася...

— Што адарвалася?

— Ну, што-небудзь там такое... частка якая-небудзь ад самалёта. Матор гапсаваўся.

— Не можа сапсавацца матор.

— Ну, а от такіх выпадкаў не было? Скажам, ляціце на аграмаднай вышыні...

Нарэшце выяўляецца, што нічога не было. Ніякіх выпадкаў. Вышыні былі і ёсць аграмадныя і будуць яшчэ больш аграмадныя, а выпадкаў не было. І шукальнік рамантыкі, йдзе з пазіцыі, выслухвае цярплівыя тлумачэнні лётчыка, які па меры сіл стараецца ўясніць яму, што самыя дробныя выпадкі прыспяньваюцца, як прыкрыя гапебныя прамазкі, якія выцяжаюць з асабістых недахопаў лётчыка, што гераізм не ў тым, што лётчык скокне з парашутам і пакіне машыну ў паветры адну і нават не ў тым, што не пакіне машыну, а разабе'е яе, ціпчэт і загіне сам з-за нежыцця, халатнасці, няўмення, лёгкадумнасці.

Ён расказвае аб тым, як тэхніка, падобная да тав. Кушчанія, праляраюць машыну да апошняга шрубіка і да апошняга міліметра троса і сцяжкі. Толькі тады машына будзе выпушчана на старт. Ён расказвае аб пілотах, што падобны да маладога пілота Астахава, якія толькі тады ўзлятаюць, калі ўпэўнянца ў добрым становішчы машыны.

Лётчык даказвае, нарэшце, шукальніку рамантыкі, што іменна ў гэтым сіла, героіка, боездольнасць чырвонай авіяцыі. Усё павінна быць праверана, усё павінна працаваць безадмоўна, усё павінна быць дысцыплінавана, арганізавана па-большэвіцку, нідзе не павінна быць хібаў, вывіхаў, промахаў. Усё павінна быць вывучана і выведана самым крапатлівым, вычэрпваючым чынам.

Ва ўмовах такой упартай, дакладнай работы выкоўваюцца баявыя, надзейныя з надзейнейшых, грозныя, крылатыя стаі паветраных сіл пролетарыята. Толькі ў гэтых умовах выхавалі большэвікі здаровых, адданых партыі людзей, імя якіх — чырвоныя лётчыкі. Непараўнанае злучэнне высокай матарызаванай тэхнікі і высокіх чалавечых сіл.

Гэта і ёсць большэвіцкі стыль. І гэта стыль — ёсць стыль работы лётнага і тэхнічнага складу часці, якой камандуе стары большэвік тав. **Кароль**.

***

Страшная ліхаманка дэпрэсіі патрасае капіталістычны свет. Вынік гэтага—шаленая падрыхтоўка да вайны. Буржуазія ацэньвае важнасць паветраных сіл, як належыць. Яна выхоўвае лётныя кадры, яна пашырае паветраны флот па магчымасці. Лётныя кадры замежных краін камплектуюцца па класаваму прызнаку. Афіцэры-выхадцы з асяродзяў буржуазіі і памешчыкаў ведаюць толькі адно: навучыцца руйнаваць. Праходзіць пакрыху гарачка рэкордаў у імя рэкламы фірм, пад маркай навуковых даследаванняў. Слабее прамысловасць, падае ўзровень сіл. Адзіны выхад — вайна.

І паветраныя атрады абмацваюць новыя шляхі. Яны шукаюць ужо іншага. Яны вызначаюць шляхі вайны. Людзі вучацца руйнаваць і рыхтуюцца да гэтага. Яны кушлены за грошы для справы крыві і рабавання.

Нашы лётчыкі ўмеюць будаваць. Яны ўмеюць ствараць. Ад суботніка ў індэфінным калгасе да капітальнага вынаходства на карысць социялістычнага будаўніцтва — такова амплітуда творчага размаху большэвіцкай авіяцыі.

***

Гром матораў у ясным небе. Плывуць крылатыя стаі. І тысячы вачэй з захапленнем і любоўю праводзяць іх. Гэта — праца авіяцыі, дзіцяці пролетарскай рэволюцыі, грозны абаронца совецкіх граніц. Гэта для не ўзлятаў і гінуў пілоты авіяцыі, гэта яна толькі здолела спалучыць у сабе ўсе дасягненні навукі і тэхнікі не для разбою і рабавання, а для будаўніцтва социялізма і для абароны яго.

Шчаслівай дарогі, таварышы, там у паветры, над нашай багатай ураджайнай зямлёй! Шчаслівай дарогі! Насустрач сонцу вялікай і радаснай будучыні.

Паводле у Польшчы. Зніжэлая беднота на адным з выратавальных пунктаў

## СОВЕЦКІЯ МАРАКІ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 4 верасня. (БЕЛТА). Контрадмірал **Свірскі** даў сняданне ў гонар совецкіх маракоў. Контрадмірал Свірскі і тав. **Гаппер** абмяняліся прывітальнымі прамовамі.

* * *

ВАРШАВА, 4 верасня. (БЕЛТА). У Гдыні каманцыры совецкіх **караблёў** наведалі гандлёвы порт і **марскую школу**. Адначасова порт адведзелі 200 совецкіх чырвонафлотаў. У поўдзень начальнік **вучэбнага** дывізіёна лейтэнант **Сэнаўлускі** наведаў на борту судна **«Фальтын»** у гонар совецкіх каманцыраў сняданне. Дэлегацыя ў складзе 20 каманцыраў і 292 чырвонафлотаў прадпрыняла экскурсію ў Познань.

* * *

ВАРШАВА, 5 верасня. (БЕЛТА). У Гдыні прадстаўнікі совецкіх ваенна-морскіх сіл прысутнічалі на футбольным матчы. Перамогшая ў матчы каманда перадала выйграны бакал горада Гдыні совецкай эскадры, урачыстуючы яго прадстаўніку спортклуба совецкага Балтфлота. У афіцэрскім клубе адбылася вечэра ў гонар малодшага камскладу совецкай эскадры. Група совецкіх чырвонафлотаў прыбыла сёння ў Познань, дзе ў гонар яе была наладжана вечэра.

## Усеагульная забастоўка рабочых гарадскога транспарта ў Токіо

ТОКІО, 5 верасня. (БЕЛТА). Мусіцыпалітэт адхіліў патрабаванні рабочых гарадскога транспарта. Стачачны камітэт абвясціў 4 верасня ўсеагульную забастоўку.

Ятчэ да абвяшчэння забастоўкі многія рабочыя пачалі кідаць работу. 5 верасня спынілі работу ўсе рабочыя гарадскога транспарта — вагонаважатыя, кандуктары, стрэлачнікі, электраманцёры трамваю, шоферы і кандуктары аўтобусаў. Паводле слоў газет, сярод бастуючых — ніводнага штрэйкбрэхера.

## УСЯ СЯМ'Я З'ЕДЗЕНА ГРАБІЦЕЛЯМІ

*(Пісьмо работніцы-дзяўчыны з Шанхая свайму двюраднаму брату ў Владзівасток)*

Старэйшы брат Пэй!

Жыццё жыццё горкае. За гэтыя два гады шмат я перажыла і пакут і горя. Матцы хутка пацыдзесят год. У мінулым годзе бацька загінуў ад нячаснага выпадку на фабрыцы. Ён перапёў сабе рукі і хутка памёр. Нявестка памёрла ад родаў, проста ля варштата, на фабрыцы. Абураны гэтымі нячастымі, бесправёўны брат ушёк невядома куды.

Я працую на тэкстыльнай фабрыцы «Ху-тун». Мне, як ты памятаеш, толькі пайшоў 15-ы год, а я павінна ўжо карміць слабе і матку. Я працую 11,5 гадзін у дзень. Атрымліваю ад 30 да 40 цэнтаў у дзень, жыць вельмі цяжка. Маці хворая.

Бялюча табе расказваць аб смерці нявесткі. Калі яна павінна была хутка радзіць, дык адчувала сябе крыху хворай. Маці думаючы, што не так хутка нявестка радзіць і не жадаючы страціць заработку за гэту змену, паслала яе на работу. Я намагаю, што нявестка пайшла на работу толькі з чашкай рысу. Заплацілі мы ў гэты дзень не мелі, бо не было грошай.

У гэты час нявестка павінна была сваім заработкам карміць нас чатырох чалавек. Я тады ятчэ не пасмела скончыць шасцімесячны тэрмін вучэбства і не атрымлівала нічога. Брат быў зволены японскім фабрыкантам, ён быў старэйшай адмаго атрада пікетаў у часе забастоўкі на японскай тэкстыльнай фабрыцы «Жы-хуа».

Калі мы леглі спаць, тэжо знаўночы, пачулі частыя, і рэзкія стукі ў дзверы. Я спалохалася. Пакуль я ўстала з пасцелі, брат ужо іх адчыніў. Некалькі чалавек увосіць труп у пакой брата. Нявестка памёрла з дзіцём.

Ражкайваючыся ў тым, што пасцала нявестку на работу, маці кінулася на труп нявесткі і горка плакала. Брат не мог плакаць.

Хутка пасля гэтага ён пакінуў нам запіску і ўцёк. Вось яго запіска: «Праклятае і рабскае жыццё. Больш нярпець не магу. Бацьку задавіла машына, маці працавала ўсё жыццё, і цяпер яе выкінулі, як непатрэбную. Я маю сілу і энергію, але знайсці сабе работу не магу. Цяжарная жонка была задушана рабаўласнікамі зажыва з дзіцем. Рабочыя жывуць горш, чым зняволеныя. Я не магу быць рабом. Я хачу змесці з зямлі ўсіх паразітаў». Я пайшоў»...

І дагэтуль мы нічога не ведаем пра брата.

Брат Пэй! Уся наша сям'я з'едзена грабіцелямі. Як ты там жывеш? Калі ты можаш, дапамажы нам. Чакаю адказу.

Двюрадная сястра Юй-аыр.

Змешчана ў журнале «Тайпэй-дзян-жань».

5 студзеня 1934 г.

# Па Саюзу і Совецкай Беларусі

## НОВЫ ДАКУМЕНТ АБ ЛЕНІНЕ

ІВАНАВА, 4 верасня. (Інфармацыя «Праўды»). Газета **«Рабочий край»** паведамляе, што ў Яраслаўскім архіве знойдзен новы дакумент **аб В. І. Леніне.** У справах Рыбінскага паліцэйскага ўпраўлення за 1901 год знойдзена прадпісанне міністэрства ўнутраных спраў аб забароне права на жыхарства Леніну ў межах б. Яраслаўскай губерніі. У справе ёсць апісанні прымет Леніна і ўказанні на неабходнасць «наўсыпнай агентурнай слежкі».

## ГЛАВА ТУРЭЦКАЙ ВАЕННАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ АБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

КІЕЎ, 4 верасня. (БЕЛТА). Глава прысутнай на тактычных вучэннях Чырвонай арміі турэцкай ваеннай дэлегацыі генерал **Фахрэтын паша,** у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС заявіў:

—На вучэннях мы бачылі магутную тэхнічна аснашчоную Чырвоную армію. Мы бачылі многа танкаў, якія добра дзейнічалі. Мы наглядалі дзесяткі вялікай колькасці самалётаў, якія працавалі ў паветры ўгоднена і чотка. Бачылі мы на вучэннях работу і другіх дапаможных войск.

Я кажу з упэўненасцю, што ў выпадку вайны Чырвоная армія пакажа, што яна здольна бліскуча выканаць свой доўг. Гэта перш-нае, што я хацеў адзначыць.

Мы некалькі дзён знаходзімся на тэрыторыі УССР. Мы бачылі багатае будаўніцтва гарадоў і сёл гэтай краіны і багаты ўраджай калгасных палёў.

Другое, што прыцягвала нашу ўвагу—гэта бязмежная любоў, якую выказвае мясцовае насельніцтва да Чырвонай арміі і яе байцоў і камандзіра складу.

Заслугоўвае таксама ўвагі арганізаваная кіраўніцтва вучэннямі. Апарат кіраўніцтва і пасрэднікі, уладаючы абстаноўкай, найлепш забяспечылі вялікую павучальнасць вучэнняў. На працягу раду дзён мы наглядалі работу наркома абароны СССР **К. Е. Варашылава.** Скажу, што Чырвоная армія можа ганарыцца сваім правадыром. Я спадзяраджаю, што Варашылаў, — адзін з найвялікшых пажаводцаў сучасных армій.

Турэцкая ваенная дэлегацыя карыстаецца выпадкам ятчэ раз падкрэсліць, што совецка-турэцкая дружба надзвычайна мацнее.

## АДКРЫЎСЯ VI УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ ФІНУДАРНІКАЎ

Учора ў 6 гадзін вечара ў клубе імя VII з'езда прафсаюзаў Беларусі (был. саўгаспслужачых) адкрыўся VI усебеларускі злёт ударнікаў фінфронта. На злёт прыбыла больш 100 дэлегатаў.

Пад гучныя апладысменты злёт выбраў ганаровы прэзідыум у складзе Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам **Сталіным,** а таксама т.т. Гікало, Галадзеда, Чарвякова, наркома фінансаў Саюза ССР тав. Грынько і рабочы прэзідыум у складзе 25 чалавек.

На ўчарашнім пасяджэнні злёта з дакладам аб выкананні фінансавага плана за першае паўгоддзе т.т. і далейшых задачах выступіў народны камісар фінансаў БССР **тав. Хацкевіча**

## ТЭАТРЫ БССР У НОВЫМ СЕЗОНЕ

◎ **БДТ-1** адкрыў новы тэатральны сезон у **Менску** пастаноўкай п'есы К. Крапівы **«Канец дружбы».**

◎ **БДТ-2** будзе і сёлета працаваць у Віцебску. Першы паказ адбудзецца ў палове верасня.

◎ **У Гомелі** пачынае работу **БДТ-3,** які скарыстаў летні перапынак для паездкі ў Маскву, дзе падрыхтаваў новую пастаноўку «Гісторыя нашай кампоў».

◎ **Беларускі дзяржаўны яўрэйскі тэатр** вярнуўся з гастрольнай паездкі ў Ленінград і 10 верасня пачынае сваю работу ў **Менску.**

◎ **Тэатр оперы і балета** адкрые сезон у **Менску** 15 кастрычніка новай пастаноўкай оперы **«Севільскі цырульнік».**

◎ **Рускі дзяржаўны тэатр БССР** пачне новы сезон з гастролей у **Бабруйску.** Першы спектакль адбудзецца 16 верасня.

◎ **Польскі дзяржаўны тэатр БССР** закончыў гастролі ў Магілеве і зараз працуе ў **Оршы.** Пасля тэатр пераязджае ў **Барысаў.**

◎ У **Менску** сёлета будуць даваць сістэматычныя спектаклі **Беларускі тэатр юнага глядача і Беларускі ТРАМ.**

## У СНК БССР

### АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ШКОЛ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ

4 верасня СНК БССР разгледзеў пытанне аб школах для дарослых. СНК вырашыў рэарганізаваць існуючыя зараз школы і ўстанавіць на 1934-35 навучальны год адзіную пачатковую школу з трыма гадамі навучання з праграмай за чатыры класы.

Далейшая вучоба дарослых пасля скончэння пачатковай школы павінна ісці па лініі агульна-адукацыйных школ павышанага тыпу—паўнапаўнастрэдніх і сярэдніх, якія ўтрымліваюцца за кошт мясцовых бюджэтаў.

СНК абавязаў пры гэтым горсоветы, РВК, сельсоветы і дырэктароў прадпрыемстваў забяспечыць школы дарослых памяшканнямі для заняткаў, апалам і газаю наравні са школамі соцвыхавання, а Дзяржвыдавецтву Беларусі ў двухгадовы тэрмін закончыць выпуск падручнікаў для гэтых школ на адпаведных нацыянальных мовах.

### АДДЗЕЛ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З ХАТНІМ ГРЫБКОМ ПРЫ ДОМЕ ТЭХНІКІ.

Для барацьбы з хатнім грыбком СНК рашыў стварыць пры Доме тэхнікі спецыяльны аддзел і даручыў тав. **Балціну** ўстанавіць штат гэтага аддзела і нагляд за яго работай.

### СЯМІГАДОВАЯ МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА

Існуючая ў Магілеве 4-гадовая музычная школа рэарганізуецца ў 7-мігадовую. На 50 месц сёлета падана 600 заяў. Прыёмныя іспыты з'явіліся нібы аглядам дзіцячай самадзейнасці. На любы музычны сказ дзіцячы голас выводзіў дакладна заданую мелодыю. Прыёмныя іспыты выявілі шмат таленцілівых дзяцей. Да іх адносіцца дачка рабочага шаўковай фабрыкі Шваева, выхаванец школы сляпых Краўцоў і інш.

### АЛІМПІЯДА ДЗІЦЯЧАГА МАСТАЦТВА

На праведзенай у Гомелі алімпіядзе дзіцячага мастацтва прымала ўдзел звыш 100 чалавек. За высокія ўзоры мастацкіх выступленняў прэміравана 11 дзяцей. У поўным складзе прэміраван 1-ы дзіцячы дом і школа імя Лекерта.

Маніее заможны калгасны лад. Багаты ўраджай фруктаў у Беларусі.

## ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

### РАЁНАЎ, З ПОСПЕХАМ ВЫКОНВАЮЧЫХ ФІНПЛАН 3-ГА КВАРТАЛА

Пакінуць на чырвонай дошцы **Старобінскі, Буда-Кашалеўскі, Чашніцкі, Слуцкі, Любаньскі, Чырвонаслабодскі і Менскі раёны.**

Дадаткова занесці на чырвоную дошку **Старадарожскі** раён, які на 1 верасня выканаў план на 81,2 проц., **Уздзенскі** — на 77,8 проц., **Асвейскі** — на 77,5 проц.

Папярэдзіць **Асвейскі, Чырвонаслабодскі і Старобінскі** раёны аб неабходнасці ў бліжэйшую дэкаду ліквідаваць адставанне па выкананню плана дзяржпаходу.

## ЧОРНАЯ ДОШКА

### РАЁНАЎ, ЗРЫВАЮЧЫХ ВЫКАНАННЕ ФІНПЛАНА 3-ГА КВАРТАЛА

ПАКІНУЦЬ НА ЧОРНАЙ ДОШЦЫ БРАГІНСКІ, ПЛЕШЧАНІЦКІ, РАСОНСКІ, ГАРАДОЦКІ, ДРЫСЕНСКІ, СУРАЖСКІ, ДУБРОВЕНСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ І ТАЛАЧЫНСКІ раёны.

ДАДАТКОВА ЗАНЕСЦІ на чорную дошку ГОРАЦКІ раён, выканаўшы план на 1 верасня на 32,6 проц. (загадчык райфа ШКЛЯРЫК).

Папярэдзіць УШАЦКІ раён, які выканаў 40,1 проц., ЛЁЗНЕНСКІ—42,9 проц. і КЛІМАВІЦКІ—43,5 проц., што азначае ўзняў тэмпы, выкананне плана 3-га квартала (на 20 жніўня было 19,7 проц. выканання, а на 1 верасня—52,1 проц.).

## ШАХМАТЫ І ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй А. КАСПЕРСКАГА*

### ШАШАЧНАЯ ПАРТЫЯ

(Іграна 9 жніўня 1934 г.)

**Бел.**—майстар Гордон (Менск). **Чорныя**—Поўзер (Гомель).

1. c3-b4-b5-a5; 2. b4-c5, d6: b4; 3. a3: c5, f6-g5; 4. b2-c3, g5-h4; 5. g3-f4, g7-f6; 6. f4-g5!, h6: f4; 7. c3: g5, f6-e5; 8. g5-h6, c7-d6; 9. c3-b4, a5: c3; 10. d2: b4. (белыя ахапляюць абодвы флангі чорных. Такая сістэма ігры за белых з заходам на h6 на апошніх доследах лічыцца найлепшай) 10... h8-g7; 11. a1-b2, b8-c7; 12. c1-d2-c7-b6; (адзіны ход; пры g7-f6; 13. d2-c3, e7-b6; 14. b2-g3, b6: d4; 15. g3-f4 і белыя прарываюцца ў дамкі). 13. b2-a3, b6:d4; 14. f2-g3, h4-f2; 15. g1: c5, e5-f4; 16. e1-f2, g7-f6; 17. f2-e3!, f6-g5; 18. d2-c3, f4: d2; 19. c3: e1, d8-e7; 20. h6: f4, c7-b6; 21. b4-a5, b6: d4; (чорныя аслабаніліся ад слабай шашкі на f4; але ўзнікла другая слабасць на d4). 22. b2-g3, e7-f6 (нельга на c3, бо a3-b4; таксама на e5 белыя адкажуць a5-b6). 23. g3-h4, f8-g7; 24. a3-b4, f6-e5; 25. e1-d2! e5: g3; 27. h4-f2, d4-c3; 28. d2-e3, a7-b6 (адзіны ход, які мог уратаваць партыю пры недахладнай ігры белых) 29. b4: d2, b6-c5; 30. d2-e3, d6-e5; 31. f2-g3, g7-h6 пры (c5-b4, выйгравала e3-d4). 32. a5-b6, c5; a7; 33. e3-d4, e5-f4; 34. g3-e5 h6-g5; 35. e5-f6, g5; e7; 36. d4-e5. Гэта адзіная партыя, якую прайграў Поўзер у турніры. Пераможца ў турніры майстар Гордон іграў партыю з выключнай сілай, выкарыстаўшы нязначныя промахі чорных.

Майстар **ГАРДОН** (Менск), які атрымаў пярэшнства БССР на шашках у 1934 г.

# МЕНСК

* * *

Закончыўся прыём у сярэднія школы горада Менска. Поўнасцю ўкамплектаваны ўсе першыя і падрыхтоўчыя класы. У першы клас прынята ўсяго 3.214 новых вучняў. Усе дзеці 8-гадовага ўзросту на 100 проц. ахоплены школай.

Асабліва вялікі наплыў быў у пах рыхтоўчыя класы. Было падана звыш 3.000 заяў. Прынята 2.239 чал. У першую чаргу былі залічаны дзеці рабочых-ударнікаў.

Значная работа была праведзена гарАНА па разгрузцы некаторых школ і прымацаванню дзяцей да школы на тэрыторыяльнаму прынцыпу.



Брукаванне Совецкай вуліцы брусчаткай у Менску.

* * *

На працягу двух з паловай месяцаў з часу арганізацыі менскага аддзялення «Інтурыста», Менск наведала некалькі сотень замежных турыстаў. У ліку іх былі пісьменнікі, прафесары, педагогі, юрысты і іншыя. Нядаўна Менск наведаў дэлегат міжнароднага кангрэса географаў у Варшаве, выкладчык Сарбонскага універсітэта Полет.

Замежныя турысты вельмі цікавяцца сонбудаўніцтвам у сталіцы БССР, росткам клубовых і культурных устаноў. Яны наведалі БелАН, клінічны гарадок, універсітэт, дзяржаўную бібліятэку, прадпрыемствы, калгасы раёна. (Белта).

**УСЕБЕЛАРУСКІ ТЭХНІЧНЫ ТЫДЗЕНЬ** арганізуюць у пачатку кастрычніка Беларускі совет навукова-даследчых тэхнічных таварыстваў і Дом тэхнікі. У часе тыдня буйнейшымі вучонымі і спецыялістамі Масквы і Ленінграда будзе прачытана каля 80 дакладаў.

**СЕЗОННЫ ПЛАН** на месяц рацей тэрміна выканала цагельня № 8, даўжэраз пагельня перакінуючыяся на дамкратовы выраб пагны-сырцу і замоклены рыхтуецца да зімы і сезона 1935 года.

**ВЫСТАЎКА МАДЭЛЕЙ-ФАСОНАЎ** БОНРАТЫ на веснова-летні сезон 1935 года адкрыецца 4 верасня ў Доме парчатчыка. На выстаўцы прадстаўлена каля 200 розных мужчынскіх, жаночых і дзіцячых фасонаў. Выстаўка працуе з 12 да 10 гадзін увечары і будзе адкрыта да 18 верасня.

**ПЭХ ПА ВЫРАБУ ДЗІЦЯЧЫХ ПАНАК** арганізавана ў гэтым годзе на заводзе імя Мольтава.

**ТАВАРЫСКАЯ СУСТРЭЧА ПАМЖ ЗБОРНЫМІ ФУТБОЛЬНЫМІ КАМАНДАМІ МЕНСКА І МАСКВЫ** адбудзецца ў Менску 8 верасня на стадыёне «Дынамо». У склад маскоўскай каманды ўваходзяць лепшыя футбалісты Совецкага Саюза: браты **Старасцінны, Рыжаў, Ільін, Леута, Якухін** і інш. — удзельнікі міжнародных матчэў у Парыжы.

**УСЕСАЮЗНАЕ МОТА-ВЕЛА СВЯТА** адбудзецца 16 верасня ў Менску. У святкаванні прымуць удзел лепшыя матацыклісты і веласіпедысты ўсяго Саюза і каманды гарадоў Масквы, Ленінграда, Тулы, Кіева, Одэсы, Харкава і інш., усяго каля 220 чал.

**УСЕБЕЛАРУСКАЯ ВЫСТАЎКА ВЫРАБАЎ ПРОМКААПЕРАЦЫІ** адкрыецца 30 жніўня ў будзе харчавіхоў.

**ШКОЛЬНЫ БАЗАР** адкрыўся 29 жніўня ў садзе «Профінтэрна».

## ПАВЕДАМЛЕННІ

СПІС ДАКЛАДЧЫКАЎ, ВЫЛУЧАНЫХ МЕНГОРСОВЕТАМ БЯЗБОЖНІКАЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ДАКЛАДАЎ СУПРОЦЬ ЯЎРЭЙСКІХ АСЕННІХ РАЛІГІЙНЫХ СВЯТ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ, НА КЛУБАХ г. МЕНСКА.

Агурскі, Курлянд, Шавкі, Рубін, Гальмшток, Ашаровіч, Фрыдрых, Вайншток, Араковіч, Крынціц, Фінкель, Гальмшток Л., Мехшар, Левін Г., Шнайдер, Фрыдман, Левін, Спокер (БАН), Валабрынскі (Медінстытут), Бэр, Дамесск, Кабакоў, Альпаевскі (радыёзала «Окнябр»), Трубовіч, Хейфец (ВПД), Позвідворан, Альтман (яўрэйтэхнікум), Агульнік (ВКСПШ), Рубінч (10 школа), Гальмшток (гарана), Буз (8 школа), Гоман (18 школа), Палойка (17 школа), Бесейсон (18 школа), Мудлер (аўтадорраб-фак), Фурман (28 школа), Стэйман, Асенштат (28 школа), Тогер (яўрэйтэхнікум), Месерэч (курсы партактыва), Эфрон (Белазет), Вайнаўз (радыёвэнтр), Розенгаўз (Белкомунбанк), Бжэнсік (ПДО), Дадзак (ВПД), Сярэбрын (БАН), Дунец (Наркомаспеты).

Інструкцыйныя даклады адбудуцца 7-IX—34 г. у 7 гадзін вечара ў клубе будаўнікоў — вуліца Энгельса, горсовет бязбожнікаў, пакой № 1. Усім прадпрыемствам звярнуцца ў горсовет бязбожнікаў за 2-3 дні раней.

ГОРСОВЕТ БЯЗБОЖНІКАЎ.

Аддзел культуры і прапаганды лекцыяма ГК КП(б)Б даводзіць да ведамасці ўсіх слухачоў агульнаадукацыйнай вучэбнай соцпартшколы (яўрэйскай і беларускай), што іншы шашкны з'явіцца ў Дом партактыва з 7 па 10 верасня ад 60 да 10 гадзін вечара ў пакоі № 22 для перарэгістрацыі.

Аддзел культуры і прапаганды лекцыяма менгаркома КПБЕ.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.


ДЗЯРЖЦЫРК

Закрыццё сезона СЁННЯ, 6 верасня

АПОШНЯЕ ПРАДСТАЎЛЕННЕ

ЗАКРЫЦЦЁ ЦЫРКА.

Пачатак в 9 гадз. вечара. Касы адкрыта в 12 да 3 і з 6 да 11 г. веч.

СЁННЯ в 2 гадз. дня АПОШНІ РАНІШНІК ЗАКРЫЦЦЁ СЕЗОНА

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)

Мінск, кір. засн. арт. рэсп. п. м. ЛІТВІНАЎ

СЁННЯ К. Крапівы

КАНЕЦ ДРУЖБЫ

драма ў 4 дзеях.

Пачатак ў 8 гадзін вечара.

Гуляны кіно-тэатр «Чырвоная Зорка». Жаночы замежны фільм ФРАНЦУЗСКАЯ ЛЯЛЬКА На летняй эстрадзе—канцэрт

Гуляны кіно-тэатр «Пролетарый» Амерыканскі гуляны фільм Здрадніцтва Марвіна Блэйка. У фай.—КАНІ-Н-Г.

Кіно «Дзіцячы» Новая праграма у праграме—кіно-хроніка «Жанчыны Юга-Усходу»

Кіно СПАРТАК Новы гуляны кіно-тэатр СПАРТАК Пачне ў 7 частках.

Дзяржаўная бібліятэка і бібліяграфічны інстытут БССР імя Леніна (Чырвонаармейская, 9)

З 1 верасня цэнтральная чытальная зала з пастаянным аглядам навінак літаратуры, журналаў і газет

АДКРЫТА

з 9 гадзін раніцы да 11 гадзін вечара. Чытальня навукова-прадпісвіковай і чытальня аддзела тэхнікі і сельска-гаспадарчы кабінет адкрыты з 9 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара.

З 8 верасня адкрываецца кабінет работы з чытачамі. Адкрыт з 3 да 10 г. вечара ў агульным дні, а ў выхадным дні — з 9 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара.

БЮРО ІНВЕНТАРЫЗАЦЫІ жыл.-арэнд.-зямельн. кіраўніцтва Менгорсовета

Даводзіць да ведама ўсіх устаноў, арганізацый, якія карыстаюцца комунальнай маемасцю або маюць свае ўласныя будынкі,

а таксама прыватных домаўладальнікаў, што на аснове абавязковай пастановы Менгорсовета ад 1. IV. 34 г. (аб рэгістрацыі бягучых змен у складзе пакаяння і кошту маемасці дзяржаўных і прыватных домаўладанняў у г. Менску)

бюро інвентарызацыі прапануе

усім ведамственным асобам, якія праводзілі ў 1933-34 г. дабудовы, прыбудовы і перапланіроўкі ў сваіх уладаннях, а таксама зямельных участках,

у 10-дзённы тэрмін падаць гарадскому інжынеру жыл.-арэнд.-зямельн. кіраўніцтва у 2-х экз. ПЛАНЫ ЗМЕН.

У выпадку невыканання вышэй указанага на візнаўных будзе накладзен штраф згодна абавязковай пастановы Менгорсовета.

Бюро інвентарызацыі.

БЕЛКАМУНБАНК вытварае ўлік соцыяльна-бытавога будаўніцтва па становішчу на 1-IX—г. г.

У мэтах вывучэння, па даручэнню Урада, сабекошта будаўніцтва і выканання матэрыяльнай праграмы за 8 месяцаў,

БЕЛКАМУНБАНК

абавязвае ўсіх забудоўшчыкаў

прадставіць яму, а таксама і яго філіялам, якімі даная пабудова фінансуецца, справаздачнасць па форме № 13 за жнівень месяц,

не пазней 10 верасня.

Непрадставіўшыя будуць аштрафаваны.

БЕЛКАМУНБАНК.

Гарадоцкі тэхнікум механізацыі с.-г. (аўта-трактарны) працягвае НАБОР, да 15 верасня

скончыўшых семігодку на 1-шы курс, скончыўшых дзесяцігодку—на III курс.

Іспыты па выкліку з 10 верасня. Пачатак заняткаў з 20 верасня.

Тэхнікум мае буйную, незамяжаную вучэбную гаспадарку, магутную кармовую базу і забяспечвае студэнтаў пойнасцю ім тэрматам.

Дакументы з заявамі і запытамі накіраваць на адрэс: г. Гарадок (Віцебскі), тэхнікум мех. с.-г.

Прыём у Магілеўскі дзяржаўны педагагічны інстытут

на аддзяленні соц.-гістарычнае, эканамічнае і літаратурнае, падрыхтоўчыя курсы інстытута і рускія аддзяленні педкурсы ПРАЦЯГНУТ да 15 верасня 1934 г.

Іспыты — з 13 па 15 верасня.

Умовы прыёму гл. «Звязду» № 174 ад 8-VIII—34 г.

Дырэктар інстытута МАКОЎСКІ.

Усе на выстаўку швэйных вырабаў „Белшвэйтрэста"

Для шырокага выяўлення думак працоўных аб фасонах швэйных вырабаў на веснова-летні сезон 1935 г.

з 4 верасня ў 6 гадзін вечара, у доме партактыва (вул. Карла Маркса)

БЕЛШВЭЙТРЭСТ

АДКРЫЎ ВЫСТАЎКУ МАДЭЛЕЙ-ФАСОНАЎ

мужчынскага, жаночага і дзіцячага асартыменту.

На выстаўцы маюцца спецыяльныя экскурсаводы, якія даюць тлумачэнні.

Выстаўка адкрыта штодзённа з 12 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара, Уваход вольны,

БЕЛШВЭЙТРЭСТ.

Жыллеміраўніцтву Менгорсовета

ПАТРЭБЕН ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР

Заявы падаваць Жыллеміраўніцтву (Плац Волі, 2)

Гомельскі скурпромсаюз

даводзіць да ведама ўсіх устаноў, што ліквідком гомельскай арцелі „Скурпраца" з 27-VII—34 г. скончыў сваю працу і распушчан.


Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — Р. ДОДЗІН, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метрампаж — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер — Е. КАГАН, ст. друкар — З. РУБІН. Уп. Галоўлітбела № К—3213.